Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פרעלעטאריער פון אלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ПЯТНІЦА
4 сакавіка 1932 г.
№ 51 (40)

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: перадавы: Мабілізацыю сродкаў—на ўдарныя тэмпы.
С. МІЦЬКОЎ—Агра-тэхнічны работнік павінен быць сапраўдным арганізатарам калгаснай вытворчасьці (2-ая стар.)
Ударны грузіць эшалёны із лесам да сплаўных пунктаў і прыстаняй (3-я стар.)
Спаборніцтва раёнаў БССР на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы (1 стар.)
Падрыхтаваць сталёвых коняй да сяўбы (2-я стар.)
Вытравіць кулацкі дух з работы гандлюючых арганізацый (2 стар.).
Дамагчыся поўнай перамогі ў лесазагатоўках (3 стар.)
ЗА ГРАНІЦАЙ (1 стар.).

Мабілізацыі сродкаў—ударныя тэмпы

Мы будуем новыя волаты—заводы і фабрыкі. Бурным тэмпам разьвіваец па індустрыялізацыя нашай краіны. Мы ўсё больш аўдалаем перадавой тэхнікай, усё больш вызваляемся ад капіталістычнай залежнасьці. Падводзена і ўзмацняецца тэхнічная база пад нашу сацыялістычную сельскую гаспадарку, якая зьяўляецца самай буйнай у сьвеце.

Вялікі размах нашага сацыялістычнага будаўніцтва, выкананьне пляну вялікіх работ 1932 году патрабуюць бесперабойнага пляннавага фінансаваньня. Увесь плян нашага сацыялістычнай будоўлі самым цесным чынам, неадрыўна, зьвязаны з выкананьнем фінпляну. Ва ўсёй фінансавай сыстэме вольныя сродкі насельніцтва адыгрываюць вялікую ролю. Таму мабілізацыя сродкаў насельніцтва, мабілізацыя сродкаў унутры прамысловасьці зьяўляюцца баявой задачай, задачай, якая патрабуе сыстэматычнай пранцыпіяльнай, штодзённай, упартай работы. Аднак, на справе мы маем цэлы рад выпадкаў апартуністычнай недаацэнкі мабілізацыі сродкаў насельніцтва, спадзяваньне на самацёк.

Досыць адзначыць, што па ўсёй БССР плян выкананы за першы квартал 1932 г. толькі на 44 проц. Гэты процант ні ў якім разе ня можа быць прызнаны здавальняючым. Апошні месяц трэцяга кварталу павінен уносьці пералом, ударнай работай трэба навярстаць упушчаны час, дамагчыся выкананьня фінпляну на 100 проц. Перадавыя раёны БССР, разьвіваючы тэмпы мабілізацыі сродкаў насельніцтва, павінны дапамагчы адстаючым, перадаць свой вопыт барацьбы на фінансавым фронце. У гэтых адносінах Тураўскі раён, які займае першае месца па ўсёй БССР (фінплян выкананы на 86,6 проц.) павінен зьявіцца прыкладам для ўсіх раёнаў.

Недапушчальна ганебна адстаюць Камарынскі, Лельчыцкі, Старадарожскі, Асьвейскі, Уваравіцкі, Веткаўскі і Буда-Кошалёўскі раёны. Гэтыя раёны не закагаюцца па-сапраўднаму за мабілізацыю сродкаў насельніцтва. Бяздушнае, сухое адміністраванне замест масавай работы, недастатковы націск на кулацка-заможныя элементы — вось галоўная прычына.

Досыць адзначыць, што лютаўскі плян па БССР ня выкананы цалкам. Так, па с. г. падатку—на 97,3 проц., па страхоўцы—на 97,7, па самазкладаньні—на 80,5 проц. Яшчэ больш дрэнна абстаіць справа з добраахвотнымі ўзносамі. Так, па пазыцы «Троці рашаючы» плян выкананы толькі на 49,3 проц., па культзборы—на 19,5, па аднаўдасах—31,7, па акцыях Трактарацэнтру—29,9 проц. Зусім недапушчальна праходзіць аварот дзяржаўных пазык і яшчэ больш дрэнна абстаіць справа з мабілізацыяй сродкаў па сыстэме спажыўкааперацыі (30,8). Зразумела, ніякіх «аб'ектыўных» прычын няма. Ёсьць няўменьне або нежаданьне па сапраўднаму, па-бальшавіцку змагацца за мабілізацыю сродкаў насельніцтва, за кожны рубель, за кожную капейку.

БССР павінна стаць у першыя ряды па выкананьні фінпляну, павінна дамагчыся таго, каб наш фінплян быў выкананы цалкам і ў тэрмін. СНК і ЦКФ БССР абвясьцілі ўсебеларускі фінпаход. Рабочыя, калгасьнікі і ўсе працоўныя павінны прыняць самы актыўны ўдзел у пераможным правядзеньні фінпаходу. Ня можа быць ні воднага актывіста, рабочага і калгасьніка, які-б ня прыняў гарачага ўдзелу, які-б не абвясьціў сябе ўдарнікам фінпаходу. Партыйныя, прафсаюзныя і савецкія арганізацыі павінны стаць на чале, мабілізаваць масы, правесьці шырокую растлумачальную работу. З бальшавіцкай энэргіяй і напорыстасьцю правесьці фінпаход такі мі тэмпамі, каб выкананць фінплян 1 кварталу да 15 сакавіка.

Паступаючыя весткі ў рэдакцыю сьведчаць аб тым, што належнага размаху ў правядзеньні фінпаходу яшчэ няма. У радзе раёнаў райфа яшчэ не раскачаліся, яшчэ не пачалі масавай работы. Ня лепш абстаіць справа з сыстэмай спажыўкааперацыі. Паянакапленьні ня рухаюцца з мёртвага пункту, замарожваньне тавараў—неаднаразовыя выпадкі.

Тэрмін для выкананьня квартальнага пляну—невялікі. А для таго, каб выкананць фінплян на ўсе 100 проц. і ў тэрмін, трэба працаваць па-новаму, трэба яшчэ больш разьвіць энтузіязм рабочых, калгасных мас і ўсіх працоўных за баявое правядзеньне фінпаходу. Трэба даць рашучы адпор апартуністам, якія паслабляюць націск на кулацка-заможныя элементы.

Цесная ўвязка ў выкананьні ўсіх гаспадарча-палітычных задач, пастаўленых партыяй і ўрадам, рашучая барацьба на два фронты—супроць правых апартуністаў, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левых» за гібічыкаў і прымірэнцтва да іх — вось умова пасьпяховага выкананьня мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Чат кае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду забясьпечвае перамогу і на фінансавым фронце.

Нельга не адзначыць, што ёсьць тэндэнцыі ў пасобных раённых работнікаў апраўдань зьніжэньне процанту выкананьня фінпляну падрыхтоўкай да сяўбы. Такім установкам павінен быць даны самы рашучы адпор. «СНК папераджае ўсе раённыя выканаўчыя камітэты, што падрыхтоўка і правядзеньне веснавой сяўбы ня толькі не павінны зьнізіць тэмпы ў галіне мабілізацыі сродкаў, а наадварот павінны быць скарыстаны для дасягнаньня ўзмацненьня работы і поўнага выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, пры своячасовага фінансаваньня веснавой сяўбы». Гэтая дырэктыва СНК павінна праводзіцца з усёй бальшавіцкай пасьлядоўнасьцю.

Працоўныя масы СССР і БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пасьпяхова будуюць і пабудуюць сацыялізм. Наш савецкі лад гарантаваны ад крызісу. Нашы труднасьці росту перамагаюцца і будуць пераможаны працоўным энтузіязмам і энергіяй рабочае класы і калгасных мас. Мы ўпэўнена ідзем ад перамогі да перамогі.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Агульнае адступленьне кітайскага войска

ШАНХАЙ. 3-III. Уся тэрыторыя паміж пабярэжжам рэкі Янцзы і Нанкінам, за выключэньнем Усунскага раёну, ачышчана кітайскім войскам. Умацаваны раён Чанжу-Таган-Чапэй, а таксама раён Люхэ цалкам эвакуяваны кітайскім войскам. Кітайскае войска адступіла ў напрамку да гораду Гуншану (80 кілёмэтраў на захад ад Шанхаю). У Гуншане нібыта знаходзіцца штаб 19-й кантонскай арміі.

Значная частка эвакуяванай тэрыторыі занята японскім войскам.

Агульнае адступленьне кітайскага войска было праведзена з вялікай арганізаванасьцю і зьявілася поўнай неачаканасьцю для японскага камандваньня. Японскія часьці прасоўваюцца на перад з вялікай асьцярожнасьцю.

Кітайскія улады пакінулі ў Шанхаі кітайскую тэрыторыю, перабраўшыся на французкую канцэсію. Усе дакументы і архівы ураду вывезены.

Адступленьне 19-ай арміі

ШАНХАЙ. 2-III. Амэрыканская газэта «Чайна пост» зазначае, што адступленьне 19-ай арміі зьяўляецца такі тычным манэўрам. Кітайцы,—гаворыць газета,—будуць працягваць супраціўленьне на новых лініях абароны.

Газета адзначае, што захоп Люхэ даў магчымасьць японскаму войску аб кружыць кітайскія сілы ў Цзянване, Усуне, Чапэй, якія нарэшце былі эвакуаваны. Але кітайскія армія ўмацовае сваё пазыцыі ў Нанхане і Куасане, дзе яна прыпыніць далейшае японскае наступленьне.

Разам з тым чакаюць, што гарнізон зае войска Нандао таксама будзе вывезены, прычым ўвесь раён Шанхаю будзе ачышчаны ад кітайскага войска. Штаб кітайскай арміі зазначае, што эвакуацыя, праводзімая па стратэгічных меркаваньнях, закончана.

Газэта далей піша, што адзэй з прычын адступленьня кітайскага войска зьявілася затрыманьне прыбыцьця пад мацаваньняў з Нанкіну, а таксама недахоп харчоў. Штаб 19-й арміі зьвярнуўся у Нанкін і Лёйн за падмацаваньнямі.

Японская авіяцыя бамбардыруе кітайскія тылы

ТОКІЁ. 2-III. Паводле паведамленьня агенства Сімбуш Рэнго, сёньня японскія самалёты разбурылі бамбардыроўкай усе шляхі на станцыі Куньшаны (на Шанхай-Нанкінскай чыгунцы) з мэтаю прыпыніць перавозку войска з Нанкіну

Фінансавы націск ПАЗШ на Японію

ПАРЫЖ. 2-III. «Ажанс Эканамік э фінансьер» адзначае фінансавы націск ПАЗШ на Японію. Японскія банкі ў Нью-Ёрку ня могуць атрымаць ні новых крэдытаў, ні аднавіць старых, што затрудняе фінансаваньне закупак Японіяй базоўны і іншай сыравіны.



Японскія салдаты будуюць бландажы на вуліцах Шанхаю.

Наступленьне японцаў па ўсім фронце

ШАНХАЙ. 2-III. Устаноўлена, што блізка Люхэ (на поўнач ад Усуна) высадзілася 8.000 японскага войска. Высадка праводзілася пад прыкрыцьцем бесперапыннага агню з 8 японскіх суднаў.

Кітайскае войска ў раёне высадкі аказала супраціўленьне, але было разьбіта і адкінута прыбылымі японскімі часьцямі, якія беззадкладна пайшлі на аб'яднаньне з японскім войскам, апэруючым на Цзянданскім фронце. Тут японскае войска перайшло ў наступ і прымусіла кітайскае войска адыйсьці з вялікімі стратамі ў бок Цуліказа і Люказа.

У сучасны момант японскае войска праследуе адступаючыя кітайскія часьці. Адступленьне праходзіць арганізавана і ў поўным баявым парадку. Бай паміж авангардныміі японскімі часьцямі і апошнімі атрадамі кітайскага войска адбываюцца бесперапынна.

Чапэй пад гураганным агнём артылерыі

ТОКІЁ. 2-III. Як паведамляе агенства Сімбуш Рэнго, адначасова з узяцьцем Цзяньціну, японскія часьці прыступілі да бамбардыроўкі Чапэйскага фронту.

Кітайскае войска пачало ўсеагульнае адступленьне. У выніку абстрэлу Чапэю японскае войска ў раёне паўночнага вакзала запаліла кварталы, якія яшчэ ня былі разбураны. Насель ніцтва Чапэю, ратуючыся ад пажараў і бамбардыровак, накіравалася на тэрыторыю сэтльмэнту праз раку Сучжоу (Сучжоу стварае мяжу паміж сэтльмэнтам і Чапэем).

Італьянскае войска, якое аховае сэтльмэнт, разбурыла мост праз Сучжоу з мэтаю перашкодзіць струменю уцекачоў на мяжу сэтльмэнту. Адначасова адбыліся непарацыі ў спаўднёвым горадзе» (стары кітайскі горад, мяжуючы з французкай канцэсіяй), ад куль насельніцтва пачало бегчы на французкую канцэсію.

Апошнія дасягненьні ваеннай тэхнікі на шанхайскім фронце

ТОКІЁ. 2-III. У Шанхаі сёньня адбываюцца баі з удзелам авіяцыі, танкавых атрадаў. Афіцыйна паведамляецца аб ранцыі сёньня Цзяньціна, а таксама раду іншых мясцовак, якія ахоплены пажарам. Паводле японскіх паведамленьняў, кітайскае войска адступае ў напрамку Чэнжу і Люхэ. Люхэ моцна бамбардыруецца.

У гэтым-жа раёне апэруе значная частка ўноў прыбылых японскіх папаўненьняў, рыхтуючы ўдар у тыл Чапэйскага і Чэнжунскага франтоў

ПАЗШ павялічваюць сілы ваеннага флёту ў Ціхім акіяне

ВАШЫНГТОН. 29-II Морскае міністэрства апублікавала загад аб адпраўцы дадатковага аднаго лінейнага карабля, 8-мі эскадрэнных мінаносцаў і 2 крок сераў з Атлянтычнага акіяну ў Ціхі для ўдзелу ў морскіх манэўрах. Такім чынам, фактычна, амаль увесь флёт ПАЗШ будзе сканцэнтраваны ў Ціхім акіяне.

Як далей ад разбраеньня

Жэнэўская канфэрэнцыя па «разбраеньню» адхіліла прапанаваны савецкай дэлегацыяй праект усеагульнага поўнага разбраеньня. Тым самым, сабраныя ў Жэнэве прадстаўнікі 60 капіталістычных краін ясна паказалі, што іх мэты ня маюць нічога агульнага са шчырай мірам і разбраеньнем, што ўсе іх думкі накіраваны на забясьпечваньне далейшых узбраеньняў і поўнай свабоды ў падрыхтоўцы да вайны.

Ход «работы» канфэрэнцыі поўнасьцю пацьвярджае тую ацэнку, якую даў тав. Молатаў у сваёй прамове на другой сэсіі ЦВК СССР у канцы сьнежня.

«З боку кіруючых імпэрыялістычных кол,—сказаў тав. Молатаў,—робіцца ўсё для таго, каб канфэрэнцыя па разбраеньні ператварылася ў камэдыю, якая не стварэчую ніякіх труднасьцяй для кланоў імпэрыялістаў па частцы далейшых узбраеньняў. Усё робіцца для таго, каб канфэрэнцыя па разбраеньні не займалася сваёй непасрэднай задачай, і сусім не перашкаджала-б росту ўзбраеньня, асабліва мацнейшых імпэрыялістычных дзяржаў».

Найважнейшая гістарычная заслуга савецкай дэлегацыі ў тым, што яна змагла прымусіць імпэрыялістаў высьветліць свае сапраўдныя адносіны да адзінай прапановы, забясьпечваючай сапраўдны мір і разбраеньне, да прапановы краіны Саветаў. Адхіляючы ясную і простую прапанову аб усеагульным поўным разбраеньні, якая зьяўляецца адзінай гарантыяй бясьпекі ад вайны, імпэрыялісты перад сам.

Значная частка эвакуяванай тэрыторыі занята японскім войскам.

Агульнае адступленьне кітайскага войска было праведзена з вялікай арганізаванасьцю і зьявілася поўнай неачаканасьцю для японскага камандваньня. Японскія часьці прасоўваюцца на перад з вялікай асьцярожнасьцю.

Кітайскія улады пакінулі ў Шанхаі кітайскую тэрыторыю, перабраўшыся на французкую канцэсію. Усе дакументы і архівы ураду вывезены.

Адступленьне 19-ай арміі

ШАНХАЙ. 2-III. Амэрыканская газэта «Чайна пост» зазначае, што адступленьне 19-ай арміі зьяўляецца такі тычным манэўрам. Кітайцы,—гаворыць газета,—будуць працягваць супраціўленьне на новых лініях абароны.

Газета адзначае, што захоп Люхэ даў магчымасьць японскаму войску аб кружыць кітайскія сілы ў Цзянване, Усуне, Чапэй, якія нарэшце былі эвакуаваны. Але кітайскія армія ўмацовае сваё пазыцыі ў Нанхане і Куасане, дзе яна прыпыніць далейшае японскае наступленьне.

Разам з тым чакаюць, што гарнізон зае войска Нандао таксама будзе вывезены, прычым ўвесь раён Шанхаю будзе ачышчаны ад кітайскага войска. Штаб кітайскай арміі зазначае, што эвакуацыя, праводзімая па стратэгічных меркаваньнях, закончана.

Газэта далей піша, што адзэй з прычын адступленьня кітайскага войска зьявілася затрыманьне прыбыцьця пад мацаваньняў з Нанкіну, а таксама недахоп харчоў. Штаб 19-й арміі зьвярнуўся у Нанкін і Лёйн за падмацаваньнямі.

„За Савецкую Нямеччыну"

Крывавая сутычка беспрацоўных з паліцыяй

БЭРЛІН. 2-III. Па ўсёй Нямеччыне беспрацоўныя вядуць пад кіраўніцтвам кампартыі барацьбу пад лёзунгамі: «за савецкую Нямеччыну», «супроць пагрозы новай вайны», «на абарону Савецкага саюзу і савецкага Кітаю». Учора ў 26 пунктах прыморскай акругі «Васэркантэ» адбываліся дэманстрацыі беспрацоўных супроць зьніжэньня дапамогі супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць фашызму і сацыял-фашызму і за рабочага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах тав. Тэльмана. У дэманстрацыях удзельнічала 100.000 беспрацоўных.

У Гамбургу начальнік паліцыі, сацыял-дэмакрат Шэнфэльдэр забараніў дэманстрацыі, але ў буйнейшай залі Гамбургу, куды сьцякаюць беспрацоўныя з усіх раёнаў гораду, адбыўся вялізарны сход. беспрацоўных.

Сход паслаў прывітальную тэлеграму камандуючаму Далёка-Усходняй арміяй тав. Блюхеру. Звыш тысячы беспрацоўных запісаліся ў дапамогу кампартыі Нямеччыны па праведзеньні кампаніі прэзыдэнцкіх выбараў. Па аканчэньні сходу стварылася дэманстрацыя беспрацоўных у 10.000 чалавек, якія прайшлі па вуліцах, заклікаючы галасаваць за т. Тэльмана і быць гатовымі да барацьбы супроць галечы і вайны. Дэманстрацыя накіравалася да фашысцкага сходу, на якім выступаў Гітлер. Некалькі рабочых паранена стрэламі. Беспрацоўныя працягвалі дэманстраваць па ўсіх раёнах гораду.

У Бэрліне таксама адбываліся бурныя выступленьні беспрацоўных. На біржы працы рабочага раёну Нэйкёльна адбываліся крывавыя сутычкі паміж беспрацоўнымі і паліцыяй. Галодным беспрацоўным даводзіцца падзінамі прастойваць у чарзе на вуліцы. 16.000 беспрацоўных цэлы дзень чакалі сваіх некалькіх пфэнінгаў дапамогі. Сьпатканьні чакаючых беспрацоўных пачалі пратэставаць. Пачалася моцная таўканіна. 40 жанчын страцілі прытомнасьць. Чыноўнікі біржы працы выклікалі паліцыю, якая гумовымі кіямі разагнала беспрацоўных. Увесь пляц і вуліцы ў раёне біржы працы ачэплены паліцыяй. Аб вялікай галечы беспрацоўных гавораць масавыя факты самагубстваў.

Міжнародны пралетарыят у абарону міру і СССР

БЭРЛІН. 1-III. Выканком міжрабпому супольна з генэральнай радай антыімпэрыялістычнай лігі агаласілі алоэ ву да усіх працоўных.

У адозьве гаворыцца: «у кітайскіх партох канцэнтруюцца амэрыканскія, ангельскія і французкія эскадры; імпэрыялістычныя дзяржавы высаджваюць усё новае войска і падрыхтоўваюцца для ўдзелу ў падзеле Кітаю. У гэты час Ліга нацый, пры падтрыманьні II Інтэрнацыяналу, робіць усе, каб усыпіць пільнасьць працоўных мас і спрабуе ўтаіць ад іх непасрэдную ваенную небясьпеку. У Манчжурыі Японія ўзмацняе сваё войска, арганізуе белагвардзейскія банды, узмацняе свае правакацыі ў адносінах да Савецкага Саюзу і падрыхтоўвае пры падтрыманьні французкага імпэрыялізму і згоды Амэрыкі і Англіі шырокі фронт для нападу на Савецкі саюз.

Пагражае новая жудасная вайна. Гэта вайна накіравана супроць рэвалюцыйнага Кітаю і пры падтрыманьні імпэрыялістычных дзяржаў павінна быць распаўсюджана на Савецкі саюз. Кіраўнікі імпэрыялістычных армій спрабуюць пры дапамозе новай злачыннай сусьветнай вайны знайсьці выхад з вострага сусьветнага гаспадарчага крызісу. Яны жадаюць зьнішчыць рэвалюцыйны Кітай, прыпыніць сацбудаўніцтва ў Савецкім саюзе. Мільёны працоўных павінны быць забітымі і прынесены ў ахвяру для таго, каб адтэрміновать катастрофу бясспэсоўнай капіталістычнай сыстэмы.

Мы заклікаем рабочых і сялян, працоўных жанчын і мужчын усіх краін зямлі паўстаць і ўдарыць па руках падпальшчыкаў вайны. Неабходна ўзмацніць кантроль над вырабам і транспартам зброі і ваеннага рыштунку. Рабочыя і сяляне, працоўныя жанчыны і мужчыны і ўсе спачуваючыя і прадстаўнікі інтэлігенцыі павінны зьліцца ў адзін магутны міжнародны баявы фронт супроць пакоднікай японскай вайны.

Супроць імпэрыялістычных падпальшчыкаў і злачынцаў вайны, за неадкладную ачыстку Манчжуры і Кітаю ад японскага войска, супроць разьдзелу Кітаю і ў абарону савецкага Кітаю, у абарону Савецкага саюзу і сацыялістычнага будаўніцтва.



Барыкады на вуліцах Шанхаю

Гераічная клясавая барацьба Усеагульная забастоўка камунальных рабочых і служачых

ВАРШАВА. 1-III. Забастоўка гарнякоў у Дамброўскім і Кракаўскім басэйнах працягваецца. Настрой рабочых мас такі, што нават фашысцкі саюз прафсаюзаў не адважыўся прыняць закрапанаваны інспэктарам працы арбітраж.

Буржуазныя газэты вымушаны адзначыць гераізм і аднадушша дамброўскіх стачачнікаў. Катавіцкая «Полёнія» піша, што забастоўка абвастраецца і, што ўжо ў бліжэйшыя дні трэба чакаць важных здарэньняў.

ВАРШАВА. 1-III Забастоўка камунальных служачых у Варшаве распаў сюдзілася на ўсе гарадзкія ўстановы. У больніцах працуюць толькі дактары, аптэкары і частка сядзелак. Частка ковы бастуюць рабочыя газавага заводу, водаправоду, гарадзкіх садоў, тэхнічны, інжынэрны і будаўнічы аддзелы.

Забастоўка абвешчана ў знак пратэсту супроць зьніжэньня і затрыманьня заработнай платы.

ПА СССР

Падрыхтоўка да будаўніцтва новага мэталюргічнага гіганта

БАКУ. Пачаты падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва Дашкесанскага мэталюргічнага гіганту. Запасаў руды на адным толькі месцы пабудовы камбінату хопіць на 40 год пры адзавым вырабе ў 900 тысяч тон мэталю. Вугаль завод будзе атрымліваць ад Тквірчэльскіх капальняў.

Камбінат будзе пабудаваны ў 1934 годзе. Агульны яго кошт складзе 300 млн. руб. Заводы камбінату будуць вырабляць трубы, аркушовае кровельнае жалеза і белую жэсьць.

Нафтаздабыча ў другую пяцігодку будзе даведзена да 42 млн. тон і агульная патрэба Азнафты ў жалезных трубах складзе 600 тысяч тон. Дашкесанскі гігант ня толькі цалкам забясьпечыць Азнафту, але задаволіць на 58 проц. агульную патрэбу ў трубах усёй нафтавай прамысловасьці СССР. Завод будзе забясьпечваць трубамі і Туркменнафту і Сярэд азнафту

Экспэдыцыя ў савецкую Арктыку

МАСКВА. Экспэдыцыя ў Савецкую Арктыку, на прыкладу мінулага году, арганізуе «Інтурыст» у 1932 г. на ледаколе «Малыгін». Экспэдыцыя ўключана ў праграму міжнароднага палярнага году. Інтурыст экспэдыцыі: Архангельск—Зямля Францы Іосіфа (з астанаўкамі ў Бухце Ціхай і ля вострава Бел)—паўночны пункт Архіпелагу. На зваротным шляху экспэдыцыя спыніцца ля острава Альдзэр і мыса Жэланія (паўночны пункт Новай Зямлі), дзе наведае ўноў адкрытую (мэтэаралагічную станцыю. Далей экспэдыцыя спыніцца ля Білужей губы (адміністрацыйны цэнтр Новай Зямлі, дзе знаходзіцца самаедзкі савет), зробіць прыпынак ля острава Кольцуг і вернецца зноў у Мурманск.

Таварыствам «Інтурыст» атрыманы рад запросаў з затраніцы аб магчымасьці ўдзелу ў гэтай экспэдыцыі. Атрыманы таксама запрос вядомага амэрыканскага дасьледчыка выведніка Фіала

Міжкалгасныя і ўнутрыкалгасныя насенпазыкі

Павінны стаць асноўным метадам барацьбы за своячасовую засыпку насенфондаў

4 сакавіка

Барацьба за добраякаснае насеньне—яшчэ ня ўсюды пастаўлена ў цэнтр падрыхтоўкі да сяўбы. Чарапашыя тэмпы ходу засыпкі насенфондаў ня зжыты па цэлым радзе раёнаў. Гэта сьведчыць аб тым, што партыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя арганізацыі некаторых раёнаў не зразумелі выключнай важнасьці засыпкі насенфондаў у агульным ланцугу мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да сяўбы.

Асаблівы трывожныя паказьнікі мы маем на вучастку загатовак насеньня. Загатоўка насеньня ідзе такімі тэмпамі, якія ні ў якай ступені не забясьпечваюць выкананьня пляну ў вызначаны тэрмін. Апроч гэтага, у цэлым радзе месц няма належнага дагляду за загатаваным насеньнем. Так, у Веткаўскім раёне загатаванае фрайнасенканторай добраякаснае насеньне знаходзіцца ў недапушчальна дрэнных умовах. Праз сьцены складаў насеньне засыпаецца сьнегам. Адзін са складаў, дзе захоўваецца вёка і насеньне гароху, прыляпае да лядзіка і пры адлізе ў складзе ўтвараецца вільгаць. У выніку такога становішча, якасьць насеньня, якое захоўваецца на складах Веткаўскай насеннаводканторы, псуецца. Папярэднія аналізы ўсхожасьці, якія былі зроблены Горацкай насеннай станцыяй, далі вельмі трывожныя вынікі. Насеньне буркоў, дзе ўсхожасьць павінна была быць 98-100 проц., дало ўсхожасьць толькі 59 проц.

Ганебны факт з Веткаўскай насеннаводканторай зьяўляецца сур'ёзным папярэджаньнем для іншых раёнаў, для кожнага калгасу ў справе захаваньня насеньня. Мы павінны ня толькі засыпаць пэўную колькасьць насеньня, але таксама змагацца і за тое, каб гэта насеньне было высокай якасьці, каб яно дало максымальны процант усхожасьці. Добраякаснае насеньне—гэта першая ўмова падвышэньня якасных паказьнікаў у сельскай гаспадарцы і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Вопыт работы па барацьбе за насеньне паказвае, што пры бальшавіцкім апэрацыйным кіраўніцтве можна з посьпехам выкананць у тэрмін плян стварэньня насенфондаў. Характэрным прыкладам бальшавіцкай барацьбы за насеньне зьяўляецца Віцебскі раён, аб якім мы сёньня зьмяшчаем матар'ялы. У Віцебскім раёне на барацьбу за стварэньне насенфондаў мабілізаваны ўвесь актыў вёскі. Пры сельсаветах праведзены нарады па пытаньнях падрыхтоўкі да сяўбы. У цэнтры ўвагі гэтых нарад зусім правільна было пастаўлена пытаньне барацьбы за своячасовую засыпку насенфондаў. Партыйныя ячэйкі і сельсаветы ўзначаліў вопыт калгаснікаў па разгортваньні ўнутры-калгаснай насеннай пазыкі і сацыялістычнай узаемадапамогі калгаса—калгасу.

Задача ў барацьбе за насеньне на сёньняшні дзень заключаецца ў тым, каб усямерна разьвіць добрую ініцыятыву калгаснікаў у барацьбе за насеньне, узброіўшы прыдзеньне сацыялістычнай насеннай узаемадапамогі калгас—калгасу, раён—раёну, і ўнутры-калгаснай пазыкі канкрэтнымі партыйным і савецкім кіраўніцтвам.

Узор плянавай бальшавіцкай падрыхтоўкі да сяўбы

Калгас «ПРАЛЕТАРЫ», Кавалеўскага сельсавету (Бабруйшчына), разгарнуў сапраўды ўдарную падрыхтоўку да сяўбы. Актыўная работа па падрыхтоўцы фактычна пачалася з прапрацоўкі пляну веснавой сяўбы.

На сёньняшні дзень у калгасе поўнасьцю засыпаны насенны фонд, які забясьпечвае поўнае выкананьне прынятага калгасам пляну. Насеньне ачышчана і захоўваецца ў добрым стане.

Вялікую ўвагу аддаў калгас лепшым галінам падрыхтоўчай работы да вясны. Так, да гэтага часу поўнасьцю скончаны рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара, адрамантавана збруя, разгорнута шырока работа па рамонце.

У калгасе складзены брыгады да веснавой сяўбы, кожнай з брыгад вылучаны асобны вучастак працы, вылучаны брыгадзіры, распрацавана калгасам пытаньне аб адкрыцьці сталоўкі на час веснавых палявых работ, абгаворана таксама пытаньне і аб адчыненьні дзіцячых ясьляў.

Вялікую ўвагу аддаў калгас наладжаньню ўтрыманьня цягавай сілы, ведаючы добра, што ад становішча цягавай сілы залежыць посьпех веснавых палявых работ. Калгасам вылучаны спэцыяльны склад коняй для цяжкіх веснавых работ, створана асобнае харчаваньне. Вылучаны спэцыяльны фуражны фонд для цягавай сілы на час веснавой сяўбы

Чарговымі баявымі задачамі калгасу ў галіне падрыхтоўкі да сяўбы зьяўляецца поўнае абагуленьне насеньня ў тых калгаснікаў, якія нядаўна ўступілі ў калгас, здабыча насеньня гародных культур і разгортваньне працы па вывазцы гною.

А. Дамброўскі.

Спаборніцтва раёнаў БССР на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы

Тав. Чарвякоў у Гомлі

ГОМЕЛЬ. 2-III. (Наш спэцкор.) На паседжаньні прэзыдыуму гарсавету з дакладам аб задачах трэцяй бальшавіцкай веснавой сяўбы выступіў старшыня ЦВК тав. Чярвякоў. Тав. ЧАРВЯКОЎ у сваім выступленьні падкрэсьліў вынключнае значэньне ў падрыхтоўцы барацьбы за стварэньне насенфондаў у вызначаныя тэрміны.

Прыезд старшыні ЦВК падвышае тэмпы падрыхтоўкі.

Для дапамогі ў падрыхтоўцы да сяўбы і выкананьня фінпляну Гомельскі гарсавет накіроўвае ў раёны спэцыяльныя брыгады. Вяч. Палесьці.

Віцебскі раён паказвае прыклады апэрацыйнай барацьбы за насеньне

ВІЦЕБСК (Наш. кар.). З 28-га лютага па ўсіх сельсаветах Віцебскага і сельсавецкага актыву па пытаньням падрыхтоўкі да сяўбы.

Збор насеньня заняў цэнтральнае месца на ўсіх нарадах праведзеных па сельсаветах. Тут-жа на нарадах актывісты, адзначаючы баявую работу асобных калгасаў у арганізацыі насенных фондаў, бралі на сябе практычныя абавязацельствы.

Калгас «Малая Чэрніца», Замастоцкага сельсавету, шырока разгарнуў унутрыкалгасную пазыку. Калгаснік з гэтага калгасу Балткоў на нарадзе актыву ад імя калгасу выклікаў на сацспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да сяўбы калгасы Замастоцкага сельсавету. Калгасы Замасточа і «Малая Чэрніца» спаборнічаюць па зборы насеньня.

Калгаснічка калгасу «Уперад» Марыя Сёмачкіна (Замастоцкі сельсавет) арганізавала брыгаду з жанчын па зборы насеньня. На працягу некалькіх дзён яе брыгада сабрала сярод калгаснікаў 16 кілёграм і 770 грам розанага гароднага насеньня. Актыў сельсавету пастанавіў прэміраваць Сёмачкіну Марыю і яе брыгаду.

Трэба адзначыць, што побач з узорамі бальшавіцкай работы па зборы насеньня, якія паказваюць асобныя калгасы і калгаснікі, у некаторых старшынь калгасаў ёсьць яўна апартуністычныя настроі. На нарадзе актыву старшыня калгасу «Чырвоная зорка» Камлёў (Замастоцкі сельсавет) выступіў супроць збору насеньня ўнутры калгасу. Сам Камлёў не адмаўляе, што ў калгасе «Чырвоная зорка» ёсьць лішкі насеннай цыбулі, але да збору немагчыма прыступіць з-за таго, што... зараз вялікія марозы.

З нарады актыву Даўжанскага сельсавету высьветлілася, што партыйная і сельсавет не забясьпечылі апэрацыйнае кіраўніцтва падрыхтоўчай работай да сяўбы. Калгас «Шлях Ільліча», не прыступіў да збору насенных гародніны, у якім калгас адчувае вялікую патрэбу. Тое, што ў калгасах Даўжанскага сельсавету магчыма з посьпехам арганізаваць унутрыкалгасную пазыку сьведчыць факт, што толькі за два дні 27 і 28 лютага ў калгасе «Сілач» калгаснікі сабралі адзін цэнтнэр гароднины.

На нарадзе актыву ў Шумянскім сельсавеце меліся такія выступленьні: «У нас насеньня хопіць таму, што пасеўную плошчу ня будзем шматраць». Гэтыя настроі атрымалі рашучы адпор. Для праверкі становішча калгасных насенных фондаў тут-жа на нарадзе былі высунуты самаправерачныя брыгады. Гэтая самаправерка ператварылася ў спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і арганізацыю насенных фондаў. Нарада актыву выдзяліла прапанову аб арганізацыі чырвонай павозкі для загатоўкі насеньня. Прапанова была адразу-ж падтрымана. Сельпо ўзялося арганізаваць гэту павозку і вылучыць адпаведны зрэмільны фонд.

Шырай разгортваючы ўнутрыкалгасную пазыку, збор насеньня, сельсаветы і калгасы Віцебскага раёну прыкладам перадавых пазіцыяў адстаючых.

Шубін.

„На дрэнным кані далёка не паедзеш“

Сталёвыя коні да бальшавіцкай сяўбы не гатовы. 10 га сакавіка апошні тэрмін сканчэньня рамонту трактароў і с. г. машын. Зацяжны і нядобраякасны рамонт ставіць пад пагрозу выкананьне дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Белсельснаб, Трактарацэнтр, Мэталёаб'яднаньне, рамонтныя заводы, майстэрні, МТС — ад вас залежыць посьпех рамонтнай кампаніі. Дайце сацыялістычным палём добра адрамантаваны трактар і машыну ў тэрмін.

Замест 1.500 трактароў—0

Белсельснаб ня выканаў дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб сваяўчасовым завозе трактароў і с. г. машын да веснавой сяўбы. Паводле зьвестак Белсельснабу з 1.500 трактароў для БССР на 18 лютага ніводнага трактара не адгружана з Ленінградзкага заводу навінны былі прыбыць 25 трактароў, а з Харкаўскага заводу 30 для калгасаў рэспубліканскага значэньня, а з іх на сёньняшні дзень не адгружана ніводнага.

Вызначаныя фонды глебаапрацоўчых машын адгружаны толькі на 60 проц. Ня лепш з запаснымі часткамі для трактароў і с. г. машын. Паводле зьвестак на 18 лютага заключаны дагавор толькі з адным заводам па вырабу запасных частак.

Такія адносіны Белсельснабу да гэтай важнейшай справы інакш цельга разглядаць як бязьдзейнасьць гэтай арганізацыі.

Становішча з запаснымі часткамі выклікае прастоі ў рамонтных майстэрнях. Так, менскія рамонтныя майстэрні чакаюць 280 шт. хамутоў, розных камутатараў, розкіаў і г. д. і да гэтага часу Белсельснаб не пераслаў у майстэрню ніводнай запаснай часткі. З 130 трактароў, якія павінны адрамантаваць майстэрня на 20 лютага выпушчана толькі 60 проц.

Перабоі ў рамонце ўтвараюцца і па віне заказчыкаў. Белкаапсаюз павінен быў даставіць у майстэрню 12 трактароў для рамонту і па сёньняшні дзень ніводнага трактару няма. Сьві патрэст не дадаў майстэрням 76 проц. трактароў.

Пост «СБ» М. Л.

Сталёвыя коні пад сьнегам.

Пад жорсткі кантроль работу рамонтных заводаў

Мінуў апошні тэрмін сканчэньня рамонтнай кампаніі да веснавой сяўбы.

15 студзеня навіна была быць за канчана работа па пабудове ўсіх майстэрняў для рамонту с. г. машын. На справе да 17 лютага толькі 4 майстэрні прыступілі да рамонту трактараў. 13 майстэрняў бягучага рамонту ня прыступілі яшчэ да работы. Чым-жа можна тлумачыць такую злачынную бязьдзейнасьць і бюстурботнасьць?

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб правядзеньні веснавой с. г. кампаніі для Трактарацэнтру не зрабілася яшчэ праграмай канкрэтнай дзейнасьці ў галіне рамонту. На 17 лютага згодна зьвестак Трактарацэнтру па 9 майстэрнях траба было выпусьціць з рамонту 1.171 трактар. На справе адрамантавана толькі 33,6 проц. паводле пляну.

Трактарацэнтр да гэтага часу ня мае запасных частак як для трактароў, так і для плугоў, а разам з тым спасылаецца на «аб'ектыўныя ўмовы», узвальваючы ўсю віну на заводы, ад якіх «чакае» прысылкі запасных частак.

Да гэтага часу Белмэталяаб'яднань не, якое таксама адказвае за выраб запасных частак і рамонт трактароў, не займалася, як сьлед, гэтымі пытаньнямі.

Завод «Камінтэрн» (Віцебск) павінен адрамантаваць 120 трактараў, а на 17 лютага адрамантаваў толькі 3 трактары. Магілёўскі завод «Чырвоны Адраджэнец» паводле пляну павінен адрамантаваць 140 трактароў і да 17 лютага ніводнага не адрамантаваў. На завод прыбыло 7 трактараў, але да іх рамонту не прыступлена. Гомельскі завод «Рухавік Рэвалюцыі» паводле пляну павінен адрамантаваць 35 трактараў, а дастаўлена заводу з месц 10 трактараў і ніводзін не адрамантаван.

Раённым партыйным і савецкім арганізацыям трэба ўзяць пад асабліві кантроль работу гэтых заводаў.

Брыгадзір «СБ»: Хмель.

13 разабраных трактароў пад сьнегам

АДДАЦЬ ПАД СУД БАРАНАВА—ЗРЫЎШЧЫКА БУДАЎНІЦТВА НОВАЙ МАЙСТЭРНІ

Па заданьні Наркамзему трактарная майстэрня Белмалірамтрэсту да 1 сакавіка навінна адрамантаваць 130 трактароў. На сёньняшні дзень майстэрня заключыла ўмовы з саўгасамі на рамонце 136 трактароў, з якіх паступіла ў рамонт 114. К тэрміну майстэрняй рамонт ня выкананы. Адрамантавана толькі 15 трактароў і 73 маторы.

У майстэрні ёсьць рад буйных чэла хоцаў: на дварэ валяюцца пад сьнегам 13 разабраных трактароў і шмат розных каштоўных частак ад іншых машын і сельскагаспадарчага інвэнтара.

Да гэтага часу майстэрня працавала на дзьве зьмены (37 рабочых), а зараз з-за адсутнасьці частак і матар'ялу працуе ў адну зьмену (26 рабочых).

Умовы для работы дрэнныя: двор і майстэрня цесныя, такарныя і іншыя станкі стаяць у майстэрні амаль адзін на адным, (няма дзе зьвярнуцца і прайсьці). Памяшканьне майстэрні не апальваецца, рабочыя працуюць на самых складаных дэталяў машыны ў вопратцы.

Будаўніцтва новай майстэрні, якое вызначана скончыць да 15-II з-за шкодніцкай работы прараба Баранава (былога афіцэра) сарвана, у той час калі новая майстэрня дала-б магчымасьць правесьці ў тэрмін рамонт большасьці трактароў.

Ня гледзячы на тое, што рабочыя майстэрні і старшыня заўкому т. Стульбаў больш месяца таму назад патрабавалі ад дырэкцыі Белмалірам трэсту зьняць Баранава з працы, але дырэкцыя і да гэтага часу ніякіх мер да Баранава ня ўжыла.

Дырэктар т. Сьмірноў амаль ня бывае ў майстэрні і ня ведае што там робіцца. Калі запыталі ў намесьніка дырэктара чаму ня апальваюцца майстэрні дык той адказвае:

—«Нічога ня ведаю пра гэта. Гэта справа нам не пад сілу!»

Белгасселсьснаб сваю работу ў напрамку забесьпячэньня трактарных майстэрань запаснымі часткамі і неаб ходным матар'ялам—праводзіць сама цёкам. Тэрмін сканчэньня рамонту трактароў працягнут да 10-III, але пры такой безгаспадарчасьці з боку дырэкцыі план работы можа сарвацца.

С. Гусеў.

Калі дырэктару „уціраюць акуляры“

Здаецца, рамонт трактароў па Аршанскай МТС павінен быў ужо скончыцца. З 22-х трактароў на 25-II—работнікі МТС заявілі:

— 18 трактароў гатовы да веснавога бою!

Але рамонт трактароў зроблены кепска. Праслаўлінкам НКФ і ст. механікам Заслаўскай МТС было зараз жа узьнята пытаньне перад дырэктарам і РК КП(б)Б аб стварэньні камісіі па праверцы адрамантаваных трактароў.

Нават пры надворным агляде адрамантаваных трактароў заўважана, што ніводнага трактара нельга пусьціць на калгаснае поле. Камісія зацікавілася ўнутранай якасьцю рамонту трактароў. Было разабрана 2 маторы. Аказалася, што ўнутраны рамонт зроблен шкодніцкі.

Падшыпнікі забіты азбэстам, адгалінны для змазкі шатунных падшыпнікаў пры заліўцы ў блёках карэнных і шатунных падшыпнікаў аказаліся непрытранымі да шыяк каленчатага валу. Пры праверцы клапанаў матор не прамываўся і застаўлен з нажаком. Шатуны, якія злучаюцца з каленчатым валам балтамі—сарваны разьбой.

Пры такой якасьці рамонту ўвесь парк трактароў Аршанскай МТС мог быць выведзены са строю ў часе сяўбы.

Дзе прычыны?

Прычыны ў адсутнасьці ўсялякага тэхнічнага кіраўніцтва з боку спецыялістаў. Да гэтага трэба дадаць, што пануе рвацтва з боку некаторых спецыялістаў. Культмасавая работа адсутнічае. Рабачком ня цікавіцца работай МТС. Партыйцаў тут зусім няма.

Дырэктар МТС вельмі нагружаны, і па сутнасьці, ня ведае становішча майстэрні. Часта дырэктар заходзіць у майстэрню і тут яму «уціраюць акуляры», гаворачы:

— У нас усё добра!

Трактарацэнтр павінен зараз-жа прыняць усе захады да таго, каб узмацніць тэхнічнае кіраўніцтва МТС. Трэба прыцягнуць да адказнасьці кан кретных вінавайцаў зрыву рамонту.

Мэханік Багумінаў.

За культурны савецкі гандаль

Вытравіць нэпманскі дух

з практыкі работы гандлюючых арганізацый

Пакончыць са спробамі аднаўленьня камэрцыйнага крэдытаваньня, парушаючага асновы гаспадарчага разьліку

Фінкрэдытныя ўстановы—на варце гаспадарчага разьліку ў савецкім гандлі

Разгортваньне культурнага савецкага гандлю праз сыстэму каапэрацыйных разьмеркавальнікаў, гандлюючых пунктаў Дзяржгандлю і савецкіх рынкаў—адна з асноўных задач у рабоце па палепшаньні матар'яльна-бытавых умоў жыцьця рабочае клясы. Аб гэтым яскрава гаворыць апошняя пастанова СНК БССР па дакладзе Белкаапсаюзу.

Неабходна адзначыць, што гандлюючыя арганізацыі недастаткова ўсьвядомілі сабе гэтую задачу. На сёньняшні дзень з 26 намечаных да адкрыцьця савецкіх рынкаў—працуюць толькі 9. Калі гэта лічба можа нас задаволіць улічваючы, што прайшло толькі два месяцы першага кварталу, дык якасьць работы гэтых рынкаў ніякім чынам ня можа задаволіць запатрабаваньняў шырокіх мас спажыўцоў, а асабліва калгаснікаў. На савецкіх рынках часамі нельга знайсьці самых простых тавараў як дзёгаць, гліняную посудзіну і г. д. НКЗ і Белкаапсаюз ня ўжылі сур'ёзных мер для плянавага снабжэньня гэтых рынкаў калгаснай прадукцыі. Павольнымі тэмпамі разгортваецца сетка гандлёвых пунктаў. Так, па калгасным сэктары вёскі з 300 намечаных, паводле пляну, крамаў адкрыта толькі 5. У самазагатоўках існуе нездаровая канкурэнцыя. Не адведзены яшчэ раёны для загатовак райспажыўсаюзам. Яшчэ раз прыходзіцца пісаць аб тым, што генэральныя дагаворы на пастаўку тавараў для нізавой сеткі не заключаны па ўсіх галінавых аб'яднаньнях. Ня выконваецца, такім чынам, пастанова СНК СССР аб заключэньні дагавароў максімум да 10 студзеня.

Мала пахвальных водзываў можна даць, нават, аб тых дагаворах, якія ўжо заключаны. Адносіны да іх (дагавароў) з боку часткі гаспадарнікаў нельга інакш характарызаваць, як лёгкадумныя, а часамі, нават апартуністычныя, варожыя да асноўных запатрабаваньняў гаспадарчга разьліку. У гэтых дагаворох ня прадугледжаны асноўныя важнейшыя моманты гаспадарчага разьліку, ня вызначана канкрэтна ступень адказнасьці гаспадарчых органаў у выпадку невыкананьня ўзятых абавязацельстваў. У гэтых адносінах характарны даныя абсьледваньня ЦКК РСІ. Аб чым яны сьведчаць?

Яны гавораць за тое, што паасобныя каапэрацыйныя арганізацыі не вядуць плянавай работы, не наладзілі справаздачнасьць, не сыстэматызіруюць справы самазагатовак, самым грубым чынам парушаюць асновы крэдытаваньня. У Слуцку, Буда-Кашалёве, Полацку, Гомелі і інш. былі выпадкі калі каапэратары прадавалі тавары без аплаты, калі тавары завозіліся арганізацыям яўна няздольным заплаціць па рахунках. Ёсьць выпадкі, калі вядуцца апэрацыі крэдытаваньня таварамі і ўкараняецца практыка камэрцыйнага крэдыту, які яўна супярэчыць новай крэдытнай рэформе і папраўкам да яе.

Значная доля віны ў дрэнных тэмпах разгортваньня таваразвароту і ўкараненьня гаспадарчага разьліку—прыпадае і на крэдытныя органы. Зьмяшчаемыя ў сёньняшнім нумары нашай газэты матар'ялы праверкі ЦКК-РСІ ілюструюць факты, калі банкі самі дапамагаюць парушэньню правілаў гаспадарчага разьліку і праявілі гуманнасьць у тых выпадках, калі каапэрацыйныя арганізацыі прадавалі неаплочаныя тавары. Банкі часамі выказваюць згоду чакаць цэлыя дэкады пакуль тавар будзе рэалізаваны. У Полацку банк процідзейнічаў пераходу сельспажыў таварыства на гаспадарчы разьлік, лічачы гэта непатрэбным. Усе гэтыя факты сьведчаць аб паяўнасьці ў банках лібэральных адносін да парушыцеляў крэдытных законаў.

Недастаткова таксама вядуць барацьбу за ўкараненьне гаспадарчага разьліку судова-сьледчыя органы, якія затрымліваюць справу аб парушэньні гаспадарчага разьліку на недапушчальны доўгі час.

Разгортваньне культурнага савецкага гандлю, укараненьне гаспадарчага разьліку і кантроль рублём, патрабуюць шпаркай ліквідацыі ўсіх непаладаў у гэтай справе. Каапэрацыйная сыстэма павінна па бальшавіцку змагацца за ажыцьцяўленьне дырэктыў Чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б). Для гэтага патрэбна бязьлітасная барацьба з апартуністычнымі адносінамі да справы гаспадарчага разьліку, да гэтага неабходна мабілізацыя шырачэзных мас на справу разгортваньня савецкага гандлю і фарсаваньне таваразвароту.

Адсутнасьць генэральных дагавароў — тармозіць таваразварот

ВОРША. У першых лічбах студзеня г. г. праўленьне Аршанскага ЦРК павінна было атрымаць ад Белкаапсаюзу дагавары на завоз у цэнтралізаваным парадку прамтавараў і прадуктаў для рабочага забесьпячэньня. Скончыўся ўжо другі месяц першага кварталу, а Белкаапсаюзам спушчаны да газары толькі на 85.000 руб. у той час як БКС даў заданьне давесьці зварот тавараў па сыстэме АЦРК да 2-х мільёнаў руб.

Асабліва дрэнна забясьпечваецца нізавая каапэрацыйная сетка паасобнымі таварамі рабочага снабжэньня. Так, нітак занараджана на ўвесь першы квартал толькі на 180 руб., мыла на 100 руб., абутку—на 90 руб., фонд ударнікаў—1840 руб., усяго на агульнае забесьпячэньне занараджана тавараў на 2.000 руб., а разам з фондам ударнікаў на 13.774 руб. Гэта значыцца, што плян выкананы на 0,7 пр. квартальнага заданьня. Дагэтуль з боку БКСаюзу не атрыманы асыгнаваньні для прыгараднай гаспадаркі АЦРК. Гэта ў той час, калі зарплата рабочым гаспадаркі ня выплачваецца ўжо 2 з палов. месяца.

Неабходна, каб Белкаапсаюз ў тэрмінавым парадку спусьціў нарады на тавары рабочага снабжэньня і асыгнаваньні для каапгасу. Аршанскія каапэрацыйныя арганізацыі павінны, не пакладаючы надзеі на Белкаапсаюз, свае імі ўласнымі сіламі і фондамі ўзяцца за справу ўпарадкаваньня прыгарадняй гаспадаркі і падрыхтоўкі да вегетаўнай сяўбы.

Х-н.

Узмацніць кантроль рублём--паскорыць таваразварот

Плян таваразвароту па спажыўсыстэме БССР сыстэматычна ня выконваецца: за IV квартал 1931 г. ён выкананы на 74,3 проц., гадавы плян выкананы на 86,3 проц., за студзень месяц 1932 г.—78,6 проц. На 1-I-32 г. па ўсёй спажыўсыстэме было замарожана тавараў на 9,4 млн. руб., у тым ліку востра-дэфіцытныя тавары: вопратка, абутак, махорка і г. д.

Чым тлумачыцца дрэннае выкананьне плянаў таваразвароту?

Праведзенае абсьледваньне РСІ выявіла факты дрэннага плянаваньня з боку БКС, непаваротлівасьці каапэрацыйных органаў і маруднага прасоўваньня тавараў да спажыўца. Справаздачнасьць—гэтая люстра гаспадарчай дзейнасьці—недапушчальна адстае па ўсёй сыстэме: ёсьць райсаюзы, якія не далі балянсаў на 1-I-1932 г.

Самазагатоўкі, якія зьяўляюцца магутным сродкам для ўцяпленьня ў таваразварот невычарпальных мясцовых рэсурсаў, праходзяць самацёкам. Каапэрацыйныя органы займаюцца простым перапампаваньнем тавараў прамысловасьці з аднае арганізацыі ў другую, закупаюць тавары па раздробнай цане ў раздробных магазынах галінных аб'яднаньняў і гэтую сваю дзейнасьць лічаць самазагатоўкамі.

Паўстае пытаньне, якую-ж ролю адыгрывалі фінансавыя ўстановы ў справе разгортваньня таваразвароту—гэтай баявой задачы снабжэньня гарадоў і калгаснай вёскі і адначасова рашаючай прадпасылкі далейшага ўзмацненьня ўсёй фінансавай сыстэмы.

Як фінансава-крэдытная сыстэма скарыстала кантроль рублём для ўкараненьня гаспадарчага разьліку ў гандлюючых органах і стымуляваньня працэсаў пашырэньня і паскарэньня таваразвароту?

Факты, якія ёсьць, сьведчаць аб тым, што фінансава-крэдытная сыстэма стаяла ў баку ад гэтай вялізарнай справы, ня цікавілася пытаньнем таваразвароту, не сыгналізавала аб прарывах і зусім дрэнна скарыстоўвала кантроль рублём для вырашэньня баявых задач на гэтым адказнейшым вучастку.

Ёсьць шмат выпадкаў рэалізацыі тавараў гандлюючымі органамі без аплаты, пры згодзе банку. Гомельскі ЦРК сыстэматычна, на працягу доўгага часу рэалізаваў такім парадкам тавары і пры наяўнасьці астаткаў тавараў на 1-XII-31 году ў суме 630 т. руб., меў запазычанасьць пастаўнікам па неаплочаных рахунках на 840 тыс. руб. Гомельскі ЦРК фактычна зьяўляўся ўтрыманцам прамысловасьці. Гомельскі банк перадаў Белторгу для рэалізацыі, без аплаты, няходавых пачох на 260 тыс. руб. і гэтым садзейнічаў затаварванню. Буда-Кашалёўскае аддзяленьне банку, наўпрэкі распараджэньня пастаўніка, выдаў райсаюзу тавары для рэалізацыі без аплаты.

Зараз стаіць пытаньне аб поўнай гаспадарчай самастойнасьці ўсіх сельпо і буйных магазынаў. Ёсьць шэраг дырэктыў па гэтым пытаньні. Але Полацкі Банк прытрымліваецца іншай думкі. Ён ня згодны з пераводам сельпо на гаспадарчы разьлік і нават супроцьдзейнічае гэтаму.

У Слуцкім раёне, распараджэньне брыгады НКФ і Белканторы аб прадажы тавараў прыбыўшых у адрас райсаюзу—неакцэптаздольнага пастаўніка было сустрэнута ў штыкі. Раздавалися галасы, што прадажа тавараў райсаюзу зьяўляецца галавацяпствам.

Такая безадказнасьць у парушэньні крэдытнай рэформы мае месца дзякуючы мяккацеласьці банку і адсутнасьці рэагаваньня з боку пракуратуры і суда на факты зрыву гаспадарчага разьліку. За ўвесь час ня было ніводнага паказальнага працэсу. Справы, якія накіроўваюцца судова-сьледчым органам, альбо спыняюцца (Гомель), альбо замараж ваюцца (Полацк, Слуцк).

Дагавары, якія маюць вялізарнае гаспадарчае і палітычнае значэньне, якія адыгрываюць галоўную ролю ў справе ўкараненьня гаспадарчага разьліку—выглядаюць у гандлюючых органах «фільгінымі граматамі». Вось ацэнка дагавароў кіруючымі і адказнымі працаўнікамі: дырэктар Гомельскага аддзяленьня Белторгу гаворыць, што **«дагавары заключаем для формы»**, член праўленьня Полацкага ЦРК гаворыць: **«дагавор зьяўляецца простым кавалкам паперы, без усякага зьместу і практычнага значэньня»**, прадстаўнік ЗРК «Пралетарый» у Гомлі заяўляе: **«дагавары заключаем пра запас, бо запас бяды ня чыне»** і г. д.

Такая ацэнка дагавароў зьяўляецца вынікам самацёку ў справе ўкараненьня дагаворнай дысцыпліны—недастаткова канкрэтнай барацьбы фінансава-крэдытнага апарату і грамадзкасьці за аларовыя дагаворныя ўзаемаадносіны паміж гаспадарчымі органамі.

Неабходна адзначыць, што ў заключаемых дагаворах па лініі БКС, Белгандлю і інш. арганізацый няма асноўных паказьнікаў пра асартымэнт, якасьць тавараў, тэрміны дастаўкі, умовы аплаты, **разьмер адказнасьці**. Не заключаны яшчэ дагаворы на 1932 г. у гандлюючых органах. Дырэктыва СНК Саюзу аб тым, каб скончыць заключэньне лёкальных дагавораў да 20-I—ня выкананa.

Камэрцыйнае крэдытаваньне зьяўляецца зьлёйшым ворагам новага крэдытнага рэжыму і чужым элементам у сыстэме нашай плянавай гаспадаркі. Між тым, барацьба з камэрцыйным крэдытаваньнем у гандлюючых органах вядзецца яўна недастаткова. Факты рэалізацыі тавараў без аплаты зьяўляюцца адным з самых яскравых праяўленьняў камэрцыйнага крэдытаваньня. Пры аднаго-дзённых зьдзелках шырока ўжываецца дача тавару ў крэдыт. Дэбіторская і крэдыторская запазычанасьць вельмі заблытана. Выдача безвалютных чэкаў—(па сутнасьці справы—крымінальны ўчынак), парушае галоўныя прынцыпы гаспадарчага разьліку і не супрэкае рашучага адпору з боку банку і пракуратуры. Наадварот. У Полацку быў выпадак, калі пракурор дэманстрацыйна праявіў сваю незацікаўленасьць пытаньнямі гаспадарчага разьліку і парушэньнямі крэдытнай дысцыпліны.

Слабае ўкараненьне гаспадарчага разьліку зьяўляецца галоўным фактарам невыкананьня плянаў таваразвароту, замарожваньня шматмільённых таварных мас і недастатковага скарыстаньня мясцовых рэсурсаў.

Увесь фінансава-крэдытны апарат павінен быць мабілізаваны на ліквідацыю выяўленых прарываў на гэтым важнейшым вучастку: гэтым самым будзе вырашана галоўная прадпасылка для выкананьня фінпляну і ўзмацненьня грашовай сыстэмы.

Э.

С. Міцькоў

Агра-зоатэхнічны работнік павінен быць сапраўдным арганізатарам калгаснай вытворчасьці

У себеларускі зьезд агра-зоатэхнічных работнікаў, які пачынае сваю работу 5-га сакавіка набывае вялізарнейшае значэньне. Навакол работы зьезду павінна быць мабілізавана ўвага шырокіх рабочых і калгасных мас.

Асабліваасьць скліканага зьезду і яго вялікае значэньне заключаецца ў тым, што на аснове індустрыялізацыі краіны, разгорнутага па ўсім фронце сацыялістычнага наступленьня, на аснове разгорнутай барацьбы супроць земскіх зуброў і супроць «вучоных», якія спрабавалі сваю абарону кулака прыкрываць інтарэсамі агранаміі, «пра грэсыўнае» гаспадаркі, «культурнага» і «моцнага» гаспадара,—партыя дасягнула рашаючых перамог у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Ушчэнт разьбіты прароцтвы правых апартуністаў аб дэградацыі сельскае гаспадаркі, аб размычцы з серадняком, аб пагрозе разрыву саюзу пралетарыяту з сялянствам. Гэты саюз, як ніколі ўмацаваўся на новай больш высокай вытворчай базе. Калгаснае сялянства стала моцнай апорай Савецкае Улады на вёсцы. Выкрыта Прышчэпаў ічыва, Кандрацьеўшчына, якія ставілі стаўку на кулацкую гаспадарку, на капіталістычную рэстаўрацыю.

Агра-зоатэхнічны зьезд будзе абгаворваць пытаньні барацьбы за якасныя паказьнікі сельска-гаспадарчае вытворчасьці на аснове саўгаснага і калгаснага будаўніцтва.

Ня толькі карэнным чынам зьмяніліся суадносіны клясавых сіл на вёсцы, а створаны зусім новыя ўмовы для сапраўднага шырокага прыкладаньня агранамічнай навукі ў сельскай гаспадарцы.

Мы ня мала ведаем фактаў, калі рад спэцыялістых разглядалі наступленьне на капіталістычныя элемэнты, ліквідацыю кулацтва як клясы, на аснове суцэльнай коллектывізацыі—як паход супроць агранамічнай навукі, супроць сельска-гаспадарчай культуры, выступаючы, у асобных выпадках, нават супроць калектывізацыі, абараняючы кулацкія «культурныя» гаспадаркі.

«Прайшоўшыя два гады паказалі, што за навуку ў сапраўднасьці былі мы, бальшавікі, праводзіўшыя лінію ліквідацыі кулацтва як клясы, лінію стварэньня буйнае сацыялістычнае гаспадаркі, а не нашыя супраціўнікі». Гэта зараз кожнаму вядома, кожны бачыць, што ніколі яшчэ ня былі такія вялікія магчымасьці прыкладаньня навукі да сельскай гаспадаркі, як зараз. Важнейшай задачай і зьяўляецца як мага шырэй і паўней выкарыстаць гэтыя вялізарныя магчымасьці.

Мы маем ужо досыць вялікі вопыт арганізацыі вытворчасьці сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Зьезд павінен намецець канкрэтныя шляхі далейшай барацьбы за сацыялістычную сельска - гаспадарчую вытворчасьць, выходзячы з таго, што, дасягнуўшы рашаючых перамог у калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, далёка ня поўна выкарыстоўваюцца яшчэ пераваг буйнай калектыўнае гаспадаркі для сапраўднага ўзьнясьця ўраджайнасьці, разьвіцьця жывёлагадоўлі і г. д. Зараз як ніколі стаіць задача ўздыму ўраджайнасьці, разьвіцьця жывёлагадоўлі, павялічэньня таварнасьці сельскае гаспадаркі. Зусім зразумела, што гэтыя задачы могуць і будуць вырашаны толькі на аснове саўгаснага і калгаснага будаўніцтва. Таму, зьезд сваю работу, абгаварэньне ўсіх пытаньняў барацьбы за ўраджай, за агра-тэхніку, за разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі павінен праводзіць і разглядаць з пункту гледжаньня ўмацаваньня саўгасаў і калгасаў. Без правільнай арганізацыі справы ў саўгасе і калгасе, МТС ня можа быць вырашана задача барацьбы за падвышэньне якасных паказьнікаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Партыя і ўрад з усёй сілай і катэгарычнасьцю ўказваюць, што цэнтральнай задачай на даным этапе ў калгасным будаўніцтве зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў у іх сучаснай арцельнай форме, а гэта і значыць барацьба за сапраўдны сацыялістычны ўраджай, за агра-тэхніку, за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі, на аснове правільнай арганізацыі працы, на аснове ажыцьцяўленьняў 6-ці паказаньняў тав. Сталіна, на аснове бальшавіцкай барацьбы за сацыялістычнае перавыхаваньне мас і выкараненьне рэцыдываў дробна-ўласьніцкай адназасобнай гаспадаркі, на аснове поўнага асваеньня перадавой тэхнікі, якая пасьпяхова ўкараняецца ў сельскую гаспадарку. Барацьбу за правільную арганізацыю вытворчых працэсаў у калгасах, за аўладаньне агратэхнікай, за сацыялістычнае перавыхаваньне мас, трэба арганізаваць з такой-жа бальшавіцкай настойлівасьцю і энэргіяй, з якой праводзілася барацьба за будаўніцтва саўгасаў, за арганізацыю колгасаў, за пашырэньне пасеўных плошчаў, кіруючыся тым, што «калгасная праца павінна абазначаць ня проста аб'яднаную працу, пабудаваную на пачатках высокай машыновай тэхнікі, але і працу, пабудаваную на пачатках прыкладаньня навукі да сельскагаспадарчай вытворчасьці, на пачатках прыстасаваньня агра-тэхнікі ў аб'ёме ня толькі таго мінімуму, які мы некалькі год прапагандавалі аднаасобніку, але ў аб'ёме, які сапраўды адпавядае магчымасьці буйнае сацыялістычнае гаспадаркі». (Якаўлеў).

Іменна на аснове практычнага ажыцьцяўленьня гэтых важнейшых мерапрыемстваў будзе вырашана задача ўзьнясьця на нябывалую вышыню якасных паказьнікаў калгаснае вытворчасьці. У вырашэньні гэтых важнейшых і адказьнейшых задач вялізарнае значэньне і ролю адыгрываюць спэцыялістыя сельскае гаспадаркі. Між тым трэба проста сказаць, што сучасны ўдзел агранамічных сіл у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, узьняцьці культуры калгасаў і падвышэньня ўраджайнасьці зусім недастаткова і нездавальняючы. Канчаткова ня выкаранены яшчэ земскія спосабы і мэтады работы, ня ўсюды створаны належныя ўмовы для работы сельска-гаспадарчых спэцыялістых адрыў ад вытворчасьці, загрузка [illegible]най работай і г. д.). Нез[illegible]ные асобнямі спэцыялістымі [illegible]цыяў калектыўнае гаспадарк[illegible]іменьне як належыць аўладаць [illegible]алгаснай вытворчасьцю. Вось некалькі прыкладаў таго, як не павінны працаваць аграномы:

Аграном Танежацкай МТС тав. Жукоўскі, на сходзе камуністаў камуны «Новы цьлях» так растлумачвае прынцыпы разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю: «камуна—гэта вышэйшая форма калектыўнае гаспадаркі, дзе працуюць па магчымасьці, а спажываюць па патрэбнасьці». У выніку такога левацка-апартуністычнага кіраўніцтва ў тэтым калгасе зьядаецца амаль уся таварная прадукцыя, ва ўсім пануе кулацкая ўраўнілаўка.

Аграном Стара-Дарожскага калгасаюзу т. **Кунтыш** замест мабілізацыі калгасных мас на арганізацыю сустрэчных плянаў, дазволіў колгасу «Чырвоны Трудавік» і «Герой працы» скараціць пасеўныя плошчы яравых.

Многа зразумела ёсьць прыкладаў і бальшавіцкай барацьбы агра-зоатэхнічных работнікаў за правільную арганізацыю калгаснай вытворчасьці, аднак агульнае становішча абслугоўваньня калгасаў патрабуе безадкладнага і рашучага палепшаньня.

Для таго, каб агра-зоатэхнічны работнік выконваў тую ролю, якая яму належыць, ён павінен быць зараз ня толькі прапагандыстым, а сапраўдным гаспадарнікам, актыўным удзельнікам арганізацыі самой вытворчасьці ў МТС і калгасах. Агра-зоатэхнічныя работнікі павінны несьці поўную адказнасьць за ажыцьцяўленьне агра-зоатэхнічных мерапрыемстваў у МТС і калгасах. Трэба безадкладна ліквідаваць абязьлічку ў рабоце спэцыялістаў. За існуючую зараз у рабоце спэцыялістых абязьлічку адказваюць зямельныя калгасныя органы. Каб ліквідаваць абязьлічку і безадказныя адносіны да абслугоўваньня калгасаў, кожны спэцыяліст павінен быць прымацаваным да поўнай колькасьці калгасаў і павінен несьці поўную адказнасьць за ўсю агра-зоатэхнічную частку ў гэтых калгасах. Павінны быць кожнаму работніку чотка, канкрэтна вызначаны абавязкі і адказнасьць. Агра-зоатэхпэрсанал павінен цалкам адказваць за ўвядзеньне правільных севазваротаў у прымацаваных калгасах, за вызначэньне агра-правіл для брыгад, за вызначэньне тэрмінаў сяўбы, догляду, уборкі, за вызначэньне аб'ёму і парадку правядзеньня агра-зоатэхнічных мерапрыемстваў, за выбар гатункаў насеньня для канкрэтнага калгасу, за вызначэньне мерапрыемстваў па барацьбе са стратамі, за дапамогу ва ўстанаўленьні норм выпрацоўкі, за правільную арганізацыю жывёлагадоўлі (яцёлы, апаросы, правільнае кармленьне і догляд, нормы кармленьня і г. д.). Агра-зоатэхнічныя работнікі павінны несьці адказнасьць за ўсе галіны сельскае гаспадаркі абслугоўванага калгасу. Гэта значыць аграном Малакацэнтру, Сьвіноводцэнтру, абслугоўвае ня толькі фэрму, але і расьлінагадоўлю гэтага колгасу. Агра-зоатэхнічныя работнікі ў сваёй рабоце абапіраюцца на калгасны актыў, асабліва на брыгадзіраў, на апорныя прыкладныя калгасы, якія павінны быць арганізаваны ва ўсіх раёнах.

Усе спэцыялісты павінны быць безадкладна разгружаны ад тэхнічнай канцылярскай работы, асноўная задача іх гэта праца на вытворчасьці. Павінны быць безадкладна палепшаны ўмовы працы спэцыялістаў.

Што значыць не «наопул», а канкрэтна змагацца зараз за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў у іх сучаснай арцельнай форме? Гэта значыць у першую чаргу правільна арганізаваць працу ў калгасах і ліквідаваць абязьлічку. Важнейшым зьвяном у арганізацыі працы зьяўляецца правільна пабудаваная вытворчая брыгада, як асноўная вытворчая адзінка ў калгасе і належны падбор брыгадзіраў. Аўладаўшы ў першую чаргу тэхнікай правільнай арганізацыі брыгад, трэба на працягу сакавіка арганізаваць ва ўсіх калгасах брыгады па вытворчым прынцыпе, ліквідаваўшы ўжо існуючыя зараз тэрытарыяльныя брыгады — брыгады - дворкі. Устанавіць нормы выпрацоўкі, усе працэсы работы перавесьці на сапраўдную зьдзельшчыну і ўстанавіць правільны ўлік працы. Падрыхтаваць належныя кадры. У прыватнасьці падрыхтаваць ня менш 20.000 брыгадзіраў.

Канкрэтна змагацца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, гэта значыць у тэрмін утварыць насеньня фонды, склаўшы фінансава-вытворчыя пляны, па бальшавіцку падрыхтавацца і правесьці весьнавую сяўбу.

У кожным калгасе, сельсавеце, раёне, на справе арганізаваць барацьбу за ажыцьцяўленьне агра-тэхнічных мерапрыемстваў, садзейнічаючых уздыму ўраджайнасьці: своячасовая і правільная апрацоўка глебы, зяблевае ворыва, запытка папары, устанаўленьне правільных севазваротаў і правільнае чаргаваньне культур, правядзеньне спэцыялізацыі, поўнае і правільнае ўжываньне штучных утаенсьняў, своячасовая вывазка і заделка гною, вапнаваньне, сартавы і радковы пасеў, своячасовы пасеў і ўборка. На аснове практычнага ажыцьцяўленьня гэтых мерапрыемстваў ужо ў 1932 годзе ўзьвяць ўраджайнасьць у колгасах на зярнёвым на 15 проц., тэхнічных траў на 20 проц., і па бульбе на 25 проц.

Па бальшавіцку арганізаваць работу за аўладаньне агра-тэхнікай работнікамі сацыялістычнага земляробства і калгаснымі масамі. Арганізаваць у калгасах гурткі па вывучэньні агратэхнікі. Арганізаваць правільнае стаўленьне сельска-гаспадарчай літаратурай, устанавіць рэгулярнае правядзеньне агра-тэхнічных канфэрэнцый для падагуленьня вопыту барацьбы за ўраджай і агра-тэхніку. Увесьці ў сыстэму правядзеньне экскурсый ў перадавыя раёны, саўгасы і калгасы. Устанавіць ва ўсіх калгасах адказных з ліку членаў праўленьня за пастаноўку работы ў калгасе па аўладаньні агра-тэхнікай.

Вялікае значэньне ў падвышэньні ўраджайнасьці адыгрываюць дасьледчыя станцыі, работа якіх да апошняга часу адстае ад бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнае рэканструкцыі.

Безадкладна трэба ліквідаваць абязьлічку ў рабоце дасьледчых станцый і Інстытутаў. Усе дасьледчыя станцыі і Інстытуты павінны быць прымацаваны да поўных раёнаў, выходзячы са спэцыялізац

Шклоўскі раён павінен выйсці з паласы фінансавых прарываў

На працягу 1931 году Шклоўскі раён ня выходзіў з паласы прарываў, сыстэматычна, з месяца ў месяц, з кварталу ў квартал ня выконваў фінансавых плянаў.

Рад раёнаў, якія адставалі ў выкананьні фінансавых плянаў у мінулым годзе, улічылі недахопы сваёй работы і скарысталі вопыт перадавых гарадоў і раёнаў, у пачатку 32 году выйшлі з паласы фінансавых прарываў (Тураў, Мазыр, Старобін, Чэрск і інш.).

Шклоўскі-ж раён і сёлета пляцецца ў хвасьце, ён выканаў квартальны плян на 20-е лютага ўсяго на 30,9 проц.

Асноўнай прычынай ганебнага адставаньня ў выкананьні фінпляну выяўляецца тое, што ў раёне зусім ня вядзецца арганізацыйна-масавай работы на фінансавым фронце. Фінансавы актыў не арганізаваны ні ў сельсаветах, ні ў калгасах.

Да гэтага часу не ліквідавана абязьлічка ў фінпрацы і ў выніку гэтага—безадказнасьць за поўнае і своечасовае выкананьне ўсіх фінансавых абавязкаў, як кіраўніка асобных раённых арганізацый, так і гарсавету і сельсаветаў. Асабліва гэта наглядаец па за **Гарспажыўтаварыствам,** якое да 10 лютага плян паянаканьненьняў выканала толькі на 25,7 проц. Плян авансаў і ўкладаў выкананы на 0,5 проц. Гарспажыўтаварыства не правяло ніякай масавай работы вакол выкананьня пляну паянаканьненьняў у аборы авансавых укладаў. Шклоўскае аддзяленьне Белгандлю, якое займае значнае месца ў Шклоўскай гандлёвай сетцы, не сабрала ніводнай чэлеткі ні па паёх, ні па ўкладах. На запытаньне чым тлумачыцца такое адставаньне, работнікі аддзяленьня Белгандлю заяўляюць,— што іх справа толькі гандляваць, а збор паёў, авансаў і ўкладаў не ўваходзіць ў кола іх дзейнасьці.

Няма чоткай баявой работы з боку РК камсамолу і раённага савету профсаюзаў у справе арганізацыі і мабілізацыі камсамольскіх і профсаюзных мас на барацьбу за выкананьне фінансавых плянаў.

Пасасовыя сельсаветы і ўпаўнаважаныя па дапамозе сельскім арганізацыям у выкананьні фінансавых заданьняў, не адчуваюць адказнасьці за даныя даручэньні.

Бальшавіцкія мэтады барацьбы за фінпляны—сацыялабарніцтва і ўпадабайніцтва ў раёне ігнаруецца. Прамі ўстановленыя распубліканскім штабам па правядзеньні фінансавага паходу зусім не скарыстоўваюцца.

Раённая арганізацыя працуе вельмі дрэнна. Агітпрацаўнікі працуюць адчыдкасы на фабрыцы «Спартак» і на пошце. Ніякай работы перад першым тыражом пазыкі «Трэцяга рашаючага» году пяцігодкі» ачыдкаса не праводзіла, у выніку чаго рад калгасьні каў не змог прыняць удзел у тыражы.

Раённыя кіруючыя арганізацыі, РК КП(б) і РВК мабілізацыі сродкаў не аддавалі належнай увагі, слаба рэагавалі на сыстэматычныя фінансавыя прарывы, на тое, што раён за не выкананьне фінпляну занесены на чорную дошку.

Толькі ў апошнія часы кіруючымі раённымі арганізацыямі ўжыты рад мерапрыемстваў для хутчэйшага выхадзеньня раёну з паласы фінансавага прарыву. У калгасах і сельсаветах арганізуюцца суботнікі па вывазцы дроў на набыцьцё ачыцкі Трактарацэнтру. Ва ўсіх сельсаветах утвараюцца ўдарныя групы па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. У далейшым гэтыя групы мяркуецца пераўтварыць у ініцыятыўнае ядро па арганізацыі сталага фінансавага актыву.

Райкалгасаюзу дазучана на працягу 10 дзён дасканала вывяць фінансавае становішча кожнага калгасу і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі фінансавай запазычанасьці, пляхам арганізацыі здачы таварнай прадукцыі дзяржаве калгасамі, заключэньнем дагавораў на розныя віды работ і высылкі буксірных брыгад з перадавых калгасаў у адсталыя.

Рэдакцыя райгазеты **«Прамень камунізму»** праводзіць работу па заклюканьні сацдагавораў на лепшае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў паміж пасобнымі калгасамі, установамі і прадпрыемствамі і арганізуе праз рабкораў і селькораў нагляд за выкананьнем дагавораў.

На райаванчадкасу ўскладзена арганізацыя суцэльнай праверкі выйгрышаў па тыражы пазыкі «Трэцяга рашаючага» і «Трэці разнаючы» пляхам высылу на месцы работнікаў аванчадкас.

Райпрафсавет праводзіць на прадпрыемствах растлумачальную работу аб ролі і значэньні выкананьня фінансавага пляну ў справе выкананьня народна-гаспадарчага пляну цалкам. Райпрафсавет арганізуе на прадпрыемствах брыгады па ўзаемнай праверцы адшага прадпрыемства другім аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў і г. д.

Раённыя арганізацыі ўсе намечаныя мерапрыемствы па разгортваньні арганізацыйна-масавай работы, па шырокім уцягненьні рабочых калгасных і бядняцкіх мас у справу выкананьня фінансавага пляну павінны правесьці на справе. Даць апэрацыйнае баявое кіраўніцтва па выкананьні фінпляну і раён ня толькі зможа ў бліжэйшы час выйсьці з паласы фінансавага прарыву, але зможа стаць у рады перадавых раёнаў і гарадоў рэспублікі.

Усе магчымасьці для гэтага ў раёне ёсьць. Раён павінен іх поўнасьцю скарыстаць і ў бліжэйшы-ж час заваяваць перамогу на фінансавым фронце.

В. Ляхаў.

Аб выканцы і выпуску ў зварот разьменнай нікелевай манэты

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

У разьвіцьцё мерапрыемстваў, накіраваных да забесьпячэньня грашовага звароту разьменнай манэты, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет народных камісараў Саюзу ССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Даручыць Народнаму камісарыяту фінансаў Саюзу ССР выпусьціць у зварот разьменную нікелевую манэту вартасьцю дзесяць (10), пятнаццаць (15) і дваццаць (20) кап.

2. Разьменная нікелевая манэта выпускаецца ў зварот і абавязкова да прыёму ў плацяжы народуе в срэбранай манэтай.

3. Вага і разьмеры манэты ўстанаўляюцца наступныя:

10 кап.—вага 1,8 грама, і дыямэтр 17,27 мілімэтра.

15 кап.—вага 2,7 грама і дыямэтр 21,84 мілімэтра.

4. Пры выробе разьменная нікелевая манэта дапускаецца наступная адхіленьні ў вазе: тысячу рублёў памянёнай матэты—адзіны сотых частка (2 проц.) вышэй і ніжэй вагі, паказанай у арт. 3-м гэтай пастановы.

5. Зьнешні выгляд разьменнай нікелевай манэты ўстанаўляецца Народным камісарыятам фінансаў Саюзу ССР і публікуецца з падрабязным апісаньнем да ўсенагульнага ведама.

6. У адносінах выпуску, звароту і вынятьця са звароту выпускаемай на падставе гэтай пастановы манэты ўжываюцца правілы, устаноўленыя для срэбнай манэты пастановамі Цэнтральнага выканаўчага камітэту і Савету народных камісараў Саюзу ССР ад 22 лютага 1924 году аб чэканцы і выпуску ў зварот срэбнай і меднай манэты савецкага ўзору. («Вестник ЦИК. СНК і СТО СССР» 1924 г. № 3, ст. 61) і ад 30 студзеня 1925 году аб выпуску срэбнай і меднай манэты («Собр. зак. СССР», 1925 г. № 6, ст. 58).

Старшыня Цэнтральнага выканаўчага камітэту Саюзу ССР
М. КАЛІНІН.

Старшыня Савету народных камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН)

Сакратар Цэнтральнага выканаўчага камітэту Саюзу ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль.
27 лютага 1932 г.

Вясну спаткаць падрыхтаванымі

СЯННО. Калгас в. Пашкова, Латыгальскага сельсавету, ударна рыхтуецца да сяўбы. Плян веснавой сяўбы дэталёва распрацаваны, даведзены да кожнага калгасьніка.

Калгас да тэрміну выканаў плян па стварэньні насенных і страхавых фондаў. Насеньне поўнасьцю ачышчана. Закончан рамонт с.-г. машын. Калгас гатоў да выхаду ў поле.

Б. З.



Корпус верхняга кальца гідратурбіны «Большая сьпіра» якая будуецца на заз. імя Сталіна ў Ленінградзе.

Барацьба за лен

ДАБІЦЦА ПОЎНАЙ ПЕРАМОГІ

44 проц. таварнай продукцыі лёну асядае ў выніку апартуністычнага самацёку, дэмабілізацыйных настроў, ігнараваньня разгортваньня арганізацыйна-масавай работы ў аднаасобным сэктары.

Своечасовае выкананьне пляну загатовак зьяўляецца адной з важнейшых умоў пасьпяховай падрыхтоўкі да сяўбы. Ня тлеадзячы на тое, што да пачатку веснавой кампаніі застаюцца лічаныя дні, крывая лёназагатовак навольна ўзьнімаецца ўверх. 56,1 проц. выкананьня на 25 лютага—паказьнік, які гаворыць аб яўнай пагрозе пасьпяховаму выкананьню рэспубліканскага пляну.

Партарганізацыі, РВК, загатоўчыя сыстэмы і сельсаветы раду раёнаў сурёзна недаацэньваюць палітычнай важнасьці лёназагатовак. У выніку апартуністычнага самацёку, адсутнасьці сапраўднай бальшавіцкай арганізаторскай работы—сотні тон загатоўленага валакна разбазарваецца, ільняная салома ляжыць незапрацаванай.

Яскравым прыкладам гэтаму можа служыць зьмяшчаемы ніжэй матар'ял аб ходзе загатовак у пасобных раёнах. Аб чым гавораць факты датэмінаваага перавыкананьня пляну групай перадавых раёнаў і ў той-жа час недавыкананьне ніжэй процента выкананьня другой групы? Уронце, аб чым гавораць два пакажчыкі барацьбы за лён у Дуброўенскім раёне—прыклады бальшавіцкай работы Лядзінскага і Сазонаўскага сельсаветаў і злачынны зрыў загатовак у Сватаніцкім і Расінкоўскім сельсаветах?

Дуброўенская партарганізацыя, загатаўшыся ў хвасьце мас, ня сумела падхапіць пачын бальшавіцкай барацьбы за лён калгасаў Лядзінскага сельсавету, не пераключыла гэтай барацьбы ва ўсе калгасы раёну. У выніку, пад уплывам кулацкай агітацыі ў радзе калгасаў лён распранжыруецца на спажывецкія патрэбы. Крывая загатовак амаль ня зрушана з месца.

Гэтыя факты лішні раз гавораць, што ў радзе месц самацёчныя, правыя апартуністычныя ўстаноўкі не адрымалі належнага адпору, што кулацкае супраціўленьне, накіраванае на зрыў лёназагатовак ня зломлена.

Рэзкі разрыў паміж перапачатковай апрацоўкай і загатоўкай—адна з перашкод на шляху пасьпяховага выкананьня пляну ў адстаючых раёнах. Дырэктывы ЦК, якія абавязваюць мясцовыя савецкія і калгасныя арганізацыі строга ўлічваць перапачатковую апрацоўку ў адпаведнасьці з тэрмінамі загатовак, ня выконваюцца. Такое становішча ў далейшым ня можа быць цярпіма. На гэтым раннім вучастку загатовак навінен быць зробіцца рашучы пералом. Ніводнага апрацоўчага пункту без поўнай круглагадзіннай напрузкі—вось галавая задача дня. Трэба пераключыць усе сілы на арганізацыю перапачатковай апрацоўкі.

Адпаасобны сэктар пакуль яшчэ займае здачнае месца ў агульным балянсе лёназагатовак. Гэтага ня ўлічваюць правааапартуністычныя элементы, якія ў радзе месц робяць стаўку на самацёк пітай работы сярод буднянка-серадняцкіх мас не праводзяць. У выніку, адпаасобны сэктар недаатрымаў адстае. Аб чым гавораць факты? У Віцебскім раёне, напрыклад, калгасны сэктар выканаў плян на 142,8 проц., адпаасобны толькі на 16,3 проц., у Драгінскім—калгасы—135,4 проц., адпаасобнікі—33 проц., у Камарынскім—калгасы — 92,3 пр., адпаасобнікі—19,6 проц. Такія паказьнікі ходу загатовак маглі атрымацца толькі ў выніку апартуністычнага самацёку, у выніку ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду аб фарсаваньні перапачатковай апрацоўкі як у калгасах, так і ў адпаасобным сэктары.

Супраціўляючыся сацыялістычнаму наступу кулацтва імкнецца затрымаць пасьпяховае выкананьне лёназагатовак. Бязьлітасна выкрываючы апартуністычна-прымірэнчыя адносіны да кулацка-заможных элементаў, трэба з усёй жорсткасьцю націснуць на кулака, адначасова прымусіць яго неадкладна здаць лён па цьвёрдых заданьнях.

Разам з гэтым самы рашучы ўдар павінны быць нанесены дэмабілізацыйным настроям, рвацка-кучацкім тэндэнцыям. На прыкладу перадавых сельсаветаў трэба арганізаваць масавую праверку выкананьня ўсіх відаў загатовак.

Барацьба за своечасовае выкананьне загатовак, барацьба з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі ўнутры калгасаў—ёсьць неадымная частка барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Гэта ў першую чаргу патрабуе ад усіх партыйных і савецкіх арганізацый па месцах мабілізацыі ўсіх сіл з тым, каб у бліжэйшыя часы дабіцца выкананьня і перавыкананьня пляну загатовак, разгарнуць баявую работу падрыхтоўкі да сяўбы.

Разам з мастамі, на чалі мас—лёнавы шлях перамог Лядзінскай гарт[illegible]й і

ДУБРОЎНА. Прыклад, як трэба змагацца за лён паказвае Лядзінскі сельсавет. Плян лёназагатовак па сельсавеце выкананы на 121 проц.

У той час, калі агульны плян лёназагатовак па раёне выкананы ледзь на 42,2 проц., мімаволі паўстае пытаньне, якім чынам сельсавет дамогся гэтых посьпехаў?

Гэтыя перамогі сельсавет атрымаў дзякуючы таму, што партячэйка і сельсавет разгарнулі шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў і адпаасобнікаў. На правядзеньне лёназагатовак была мабілізавана ўся грамадзкасьць.

З самага пачатку лёназагатовак арганізаваны 4 брыгады. Кожная брыгада была прымацавана да пэўнага вучастку, за які і несла адказнасьць, разгортвала на гэтым вучастку шырокую арганізацыйную работу.

Праз кожныя 5 дзён брыгады зьбіраліся на нарады, рабілі справаздачы аб праробленай рабоце. Тут-жа даваліся інструкцыі як ліквідаваць той ці іншы прарыў. Паміж брыгадамі былі заключаны сацумовы на лепшае і хутчэйшае правядзеньне лёназагатовак. За выкананьне кожнага пункту сацумовы была разгорнута шырокая барацьба. Работа брыгад асьвятлялася на старонках насьценгазэт.

Кожная брыгада на сваім вучастку мабілізавала ўвесь вясковы актыў за своечасовую апрацоўку лёну. Брыгада склікала вытворчыя нарады, быў абвешчаны збор рацыяналізатарскіх прапаноў, дамагаліся хутчэйшага ажыцьцяўленьня іх.

Брыгадамі быў арганізаваны суцэльны наяўзэр паміж апрацоўкай і здачай (продажам) лёну. З мяльна сушыльных пунктаў лён адразу здаваўся на загатоўчыя пункты.

Асаблівы упор быў зроблен на барацьбу з кулацкім сабатажам, у выніку чаго паступленьне лёну па цьвёрдых заданьнях было пастаўлена на належную вышыню.

Усё гэта дрыяла таму, што Лядзінскі сельсавет да студзеня цалкам закончыў апрацоўку і поўнасьцю выканаў лёназагатоўкі. Гэтыя брыгады, арганізаваныя для пазнаёмленьня лёназагатовак, былі пераніны ў Сазонаўскі сельсавет, па якім плян лёназагатовак на 8 студзеня ледзь быў выкананы на [illegible] проц. Была скліканая аб'яднаная нарада членаў сельсавету, старшынь калгасаў, настаўнікаў, рабселькораў і ўсяго калгаснага бядняцка-серадняцкага актыву. На нарадзе выяўлены прычыны адставаньня калгаснага і адпаасобнага сэктару Сазонаўскага сельсавету. Пасьля дакладнай прапрацоўкі пастановы лістападаўскага Пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, задачы конкурсу «Праўды» быў намечаны канкрэтны плян барацьбы за лён у адстаючых калгасах.

Нарада арганізавала брыгады з лепшых ударнікаў, якія былі накіраваны ў калгасы і сельсаветы. Адзін з брыгад у калгасах «Хваля рэвалюцыі» і «КІМ» выкрыты спробы кулацкай агентуры, якая пралезла ў калгасы, разьмяшваець там лёнавалакно на спажывецкія патрэбы. Гэтым спробам брыгадамі быў дадзены рашучы адпор калгасы па-баявому прыступілі да лёназагатовак.

У кожным калгасе выпушчаны штодзённікі, якія мабілізавалі ўвагу калгасьнікаў на хутчэйшую апрацоўку лёну і выкананьне калгасамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Газэты пакалі лепшых ударнікаў і ганьбавалі лодыраў і рвачоў.

Такая-ж самая работа была праведзена па Азерскім і Чарнаруцкім сельсаветах, якія зараз наближаюцца да поўнага выкананьня сваіх плянаў.

Так, у выніку шырокага разгортваньня арганізацыйна-масавай работы Лядзінскі сельсавет дабіўся перамог на фронце лёназагатовак.

Прыклады бальшавіцкай работы

Крычаў. Праз масава-растлумачальную работу, праведзеную раённымі арганізацыямі, Крычаўшчына ладыхоліць да заняпаньня лёназагатовак. На 25 лютага плян лёназагатовак выкананы на 96 проц., трасты—на 103 проц.

Рад сельсаветаў перавыканалі плян загатовак па лёнавалакне. Так, Малявіцкі сельсавет выканаў плян на 140 проц., Бацьвінаўскі—на 119 пр. (Беста).

Дэкаднік генэральнай праверкі лікбезу

Лепшыя прыклады

барацьбы за суцэльную пісьменнасьць—ва ўсе раёны БССР

Мясцовая партячэйка і праўленьне калгасу „Чырвоная Бярозка", Слуцкага раёну па азваюць узор барацьбы за рэалізацыю дырэктыў партыі і ўраду. У калгасе ўсе няпісьменныя зі вучобай, разгорнута барацьба за якасьць навучаньня, заняткі наведваюцца акуратна. Калгасы БССР, бярэце прыклад з „Чырвонай Бярозкі".

Браць за прыклад работу ліквпункту калгасу „Чырвоная Бярозка"

Узор бальшавіцкага змаганьня за пераўтварэньне БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці паказвае ліквпункт пры калгасе «Чырвоная Бярозка» Мялешкаўскага сельсавету, Слуцкага раёну. Заняткі на гэтым ліквпункце праводзяцца сыстэматычна, бяз усякіх перабояў. Ліквпункт рэгулярна наведваюць 30 чалавек няпісьменных калгасьнікаў і калгасьніц. Падручнікамі і пісьмовымі прыладамі ліквпункт забясьпечаны. У ліквпункце ўведзена паліт і тэхгадзіны.

Настаўнік т. РАВІНСКІ, добра ведаючы палітычнае значаньне справы ліквідацыі няпісьменнасьці працуе на пункце па ўдарніку. Вялікую дапамогу ў рабоце ліквпункту аказвае мясцовая партячэйка, праўленьне гэтага калгасу і члены сельсавету.

На прыкладзе ліквпункту пры калгасе «Чырвоная Бярозка» павінны вучыцца ўсе ліквпункты Мялешкаўскага сельсавету, якія да гэтага часу ня здолелі наладзіць сваёй работы.

ХАУКІН, ШПАКОЎСКІ.

т. Сцуратовіч—качагар Эльводу, былы няпісьменны, зараз ленны ўдарнік культармеец.

Пералом ёсьць, але недастатковы

Ліквідацыя няпісьменнасьці па Барысаўскім раёне знаходзілася пад пагрозай зрыву. На горадзе ліквпунктамі было ахоплена 85 проц. няпісьменных, па раёне справа яшчэ горш,—толькі 50 проц. Гэты ганебны прарыў тлумачыцца тым, што рад партыйных, савецкіх і профсаюзных арганізацый недаацэньваюць надзвычайную важнасьць барацьбы за суцэльную пісьменнасьць. Асабліва дрэнная справа з ліквбезам была на фабр. імя Леніна, «Прафінтэрн», на Бярэзінскай вецьцы, а таксама ў Міотчанскім, Велящінскім, Зачысцкім, Чарнявіцкім, Бродаўскім і Карсакавіцкім сельсаветах.

Пасьля абвешчаньня дэкадніка генэральнай праверкі ліквбезу, Райком КП(б)Б адразу-ж уключыўся ў правядзеньне апошняга. Райком партыі выканаў рад мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць ліквідацыю прарыву на фронце барацьбы за суцэльную пісьменнасьць.

Партыйным ячэйкам і фракцыям ФЗМК даданы цьвёрдыя заданьні забясьпечыць стопроцантны ахоп няпісьменных навучаньнем, а таксама акуратнае наведваньне апошнімі заняткаў.

У выніку мабілізацыі ўвагі пралетарскай грамадзкасьці раёну, за апошнія дні назіраецца пералом: павялічыў ся ахоп няпісьменных навучаньнем, палепшаецца наведваньне заняткаў. Раённыя арганізацыі Барысаўшчыны павінны, ў самы кароткі тэрмін, дабіцца рэалізацыі дырэктыў ЦК партыі: ахапіць усіх няпісьменных вучобай, падвысіць якасьць навучаньня, змагацца за 100 проц. наведваньне заняткаў няпісьменнымі. С.

Узяць на буксір адстаючых

Ліквідацыя няпісьменнасьці па Падгайцаўскім сельсавеце, Шклоўскага раёну, зрываецца. Па сельсавеце працуе толькі 6 ліквпунктаў, якімі ахоплена 189 чалавек, што складае толькі 43 проц. агульнага ліку няпісьменных.

Райвыканкомы не пакланцаўся падрыхтаваць кадры культармейцаў. Асобныя, прымацаваныя да ліквпунктаў, асьветнікі ўпарта не жадаюць займацца на ліквпункце. На ліквпунктах, якія працуюць, наведваньне няпісьменных зусім нікчэмнае.

Партыйная і камсамольская арганізацыі сельсавету, ваш панасарэдні абавязак наладзіць работу ліквпунктаў, ахапіўшы імі ўсіх няпісьменных сельсавету. Адначасова весьці рашучую барацьбу за падвышэньне якасьці навучаньня.

Ярсні.

Дэкаднік праверкі не разгорнуты ў Бярэзінскім раёне

Зусім малую ўвагу ўдзяляюць Бярэзінскія арганізацыі работе на ліквідацыі няпісьменнасьці. На нынік гэтага, існуючыя ў раёне ліквпункты працуюць слаба. На рабоце ліквпунктаў адбіваецца і тое, што яны не забясьпечаны падручнікамі, прыладамі і пісьмовымі прыладамі. Наведваньне ліквпунктаў не пільнуецца, а нагадваецца. Больш таго, ліквпункты пры калгасе імя »Чарнявева» і ў весцы «Пагулянка». Зусім не працуюць, бо прымацаваныя да іх настаўнікі не жадаюць займацца ліквбезам.

У раёне яшчэ да гэтага часу не разгорнута работа па правядзеньні дэкадніка генэральнай праверкі, ударныя масы і пралетарская грамадзкасьць раёну не мобілізаваны на барацьбу за суцэльную пісьменнасьць.

БЯРОЗКА

УДАРНА ГРУЗІЦЬ ЭШАЛЕНЫ

з лесам да [illegible]ўных пунктаў і прыстаняй

РЭАЛІЗАВАЦЬ ЗАГАД НАРК[illegible]СА аб рабоце ўласных абоз

Наркамлес т. Лобаў у сваім загадзе ад 28-1 г.г. адзначыў: «Ня гледзячы на тое, што на ходзе працы намецілася вельмі шкодны разрыў паміж загатоўкай і вывазкай лесаматар'ялаў, улаены конскі абоз скарыстоўваецца леса прамгасам зусім не адпаведнымчна—на вывозчасьці занята 50-60 проц.». Вы ходзячы з чаго ён выпачыў рад канкрэтных мерапрыемстваў для аздараўленьня працы ўласнага транспарту, за баронена скарыстаньне абозу не па прызначэньню, забясьпячэньне яго стабільнымі кадрамі, вызначэньне канкрэтных норм выпрацоўкі для абозу, устанавіўшы дзекадзіны заданьня для кожнага каня.

Увядзеньне штодзённага вучоту працы кожнага каня, дача дзяцдных аператыўных зьвестак па вучоце скарыстаньня ўласнага абозу і інш.

Як-жа леспрамгасы праводзяць у жыцьцё загад Наркамлесу?

Трэба адзначыць, што ня гледзячы на тое, што ўласны гужтранспарт у сыстэме Лесбелу займае значнае месца (4272 коняй), гадавое заданьне па вывазцы ўласным транспартам 1.500.000 фэст—мэтраў драўніны, цэлым радам леспрамгасаў выконваюцца драмна. Леспрамгасы недаацэньваюць значэньня ўласнага транспарту, не жадаюць займацца ім.

Толькі два леспрамгасы (Гарацкі і Клімавіцкі) палічылі патрэбным заняцца палепшэньнем працы ўласнага абозу ў выніку чаго яны перавялі ўласны абоз на гаспадарчы разрахунак. Астатнія пакуль што не палічылі патрэбным займацца такімі «глупствамі».

Праваздзімае зараз простам Лесбел абсьлядваньне працы ўласнага гужнарку паказвае дрэнную работу ўласнага конскага абозу.

Мазырскі, (Кажынаўцкі) леспрамгас мае 130 коняй, якія раскіданы ў 7 месцах па 13-15-18 коняй, што значна падаражае іх работу і ўскладняе кіраўніцтва імі. Дырэктар леспрамгасу т. Сіманоўкер не жадае праявіць ці канцэнтрацыю абозу, ня гледзячы на ўказаньні Гапоўлеспрому і Лесбелу. Карліковыя-ж абозы ні ў якім разе ня могуць аправудаць сябе. Леспрамгас не палічыў патрэбным забясьпечыць абоз сталымі кадрамі і замацаваць іх, у выніку чаго ў рабочыя абозы ўбіліся ўсялякія людзі, якія падрываюць працу абозу.

У выніку адсутнасьці арганізаванага набору рабочай сілы і замацаваньня яе, утвараецца цякучасьць рабочых. За апошні час у адным толькі абозе Нахаўскага лесавучастку (24 коняй) кінула працу 10 рабочых, па ступіла 6,. За студзень замест 621 конядня, абоз у гэтым вучастку адпрацаваў толькі 430 конядзён. 191 канадзень прагулу, гэта толькі па адным вучастку.

У леспрамгасах панує паўнейшая абязьлічка ў кіраўніцтве абозам, без адказныя адносіны да яго панующь усюды, а пра гаспадарчы разрахунак і вучот таварыць ня прыходзіцца.

Таксама няма вучоту працы абозу, бо прыёмшчыкі складаў рабіць прыёмку толькі праз месяц.

Адсутнічае культурна выхаваўчая праца сярод рабочых абозаў. Сацыяборніцтвам і ўдарніцтвам у абозе ніхто не займаўся.

Толькі на аснове гаспадарчага разрахунку, кантролю рублём і баявой рэалізацыі загаду тав. Лобава, абоз Лесбелу выканаць ускладзеныя на яго задачы, 6 пістарычных умоў тав. Сталіна павінны быць зараз-жа ўкаранены ва ўсёй працы ўласнага абозу.

Альпэровіч.

Ардашнікаву патрэбна раскачка...

Апарат Беллесаснабзбыту канчатко ва анасьцянеў. Складаецца такое ўражаньне, што не паціскуўшы як сьлед на Лесазбыт,—нічога ад яго не даб'ешся. Вось некаль фактаў:

З Масквы атрымліваецца нарад за гатовіць 700 куб. м. экспартнай тары для яек. Беллесаснабзбыт і рукамі і нагамі: «ня можам». Адпаведныя органы крыху націснулі. Лесаснабзбыт заварушыўся і 175 куб. м. тары разьвярстаў паміж заводамі. А далей ні з месца. Націснулі мацней, і астатнія 525 куб. м. таксама былі разьвярстаны.

Але вось падасьпеў яшчэ адзін нарад на 150 куб. м. тары. «Не, сказаў абураны загадчык Беллесаснабзбыту т. Ардашнікаў, годзе; болей не дамо ніводнага мэтра».

Прадстаўнік зацікаўленай арганізацыі заўважыў, што мабыць і на гэты раз прыдзецца стукнуць па патыліцы, каб прымусіць Лесаснабзбыт выканаць распараджэньне Масквы.

— Ну што-ж,—адказаў т. Ардашнікаў,—тады мы дамо нарады, але якы будуць не рэальнымі!

— Ну, а тыя нарады на тару, якія вамі ўжо дадзены, будуць выкананы, ці не,—зноў запыталіся ў т. Ардашнікава.

— Ня ведаю, ня ручаюся, бо ў Маскве сядзяць бюракраты,—адказаў ён.

— Ну, а калі так націснуць, як раней, тады што?

— Але-ж,—згадзіўся т. Ардашнікаў,—мы як лянівы конь: на нас што ўбіў, то ўехаў.

Трэба дадаць, што т. Ардашнікаў добра ведае, што нарады на тару маюць на ўвазе забясьпечыць наш экспарт і такія адносіны да гэтай важнейшай справы з яго боку недапушчальны.

А. Уласін.

Рыхтуюць лес да сплаву

Аздаравіць Багданаўскі лесвучастак

Багданаўскі лесавучастак, Барысаўскага леспрамгасу, працуе такімі тэмпамі, якія не забясьпечваюць выкананьня ў тэрмін пляну дровалесазагатовак і вывазкі. У 1932 годзе ён павінен загатовіць 23.900 кубамэтраў будматар'ялаў і 14.100 раўмэтраў дроў. Лічбы-ж выкананьня пляну паказваюць, што Багданаўскі лесавучастак не спраўляецца з выкананьнем заданьняў. На 10 лютага загатоўлена 19,74 проц. будматар'ялаў і 17,38 проц. дроў квартальнага заданьня. Горш абстаіць справа з дровалесавывазкай. На 10 лютага будматар'ялаў вывезена 15,67 проц., дроў—13,63 проц.

Замест патрэбных для выкананьня пляну 480 падвод, штодзённа працуе толькі 230. Лесавучастак не заключыў з вызначанымі яму сельсаветамі дагавораў на гужавую сілу.

Запатрабаваньні возчыкоў аб прымацаваньні іх да кожнай брыгады лесарубаў ня выконваюцца. У выніку возчыкам самім даводзіцца ачышчаць дарогу і з гэтай прычыны прастойваць.

Ёсьць блытаніна ў разуменьні апошняй пастановы Калгаспэнтру аб 75 процантным даходзе ў карысьць калгасьнікаў. Ёсьць выпадкі, калі адлічаюць 60 процантаў і нават менш.

Барысаўскі леспрамгас павінен прыняць тэрміновыя меры да аздараўленьня Багданаўскага лесавучастку, які ня справіўся са сваімі заданьнямі ў выкананьні пляну дровалесазагатовак і вывазкі.

С.

„Няма часу, далёка ехаць"

СТАРОБІН. Месячнік загатоўкі і вывазкі лесу на Старобінчыне прадстаўляе бязрадасны малюнак. Вывазка будаўнічых матар'ялаў 51 проц., вывазкі дроў—23 проц. Вось вынікі месячніка на сёньня.

Апартуністычна-прымірэнцкія адносіны Чапелеўскага і Чырвона-Борскага сельсаветаў да кулацтва прывялі да таго, што цьвёрдыя заданьні па леса вывазцы ня выконваюцца.

Слаба ўдзельнічаюць у лесавывазцы калгасы. Некаторыя праўленьні калгасаў замест мабілізацыі калгаснікаў на лесазагатоўкі, займаюцца апартуністычнымі разважаньнямі накшт таго, што «далёка ехаць», «няма шыноў да падковаў», «няма часу» і г. д.

Калгас «Камунар» і «Чырвоная Мяжа» атрымалі ад леспрамгасу квасам сам-двое у лес лесавыраўні, у лес не паслалы ніводзін калгаснік, чаму?

Копус верхняга кальца гідратурбіны «Большая сьпіра» якая будуецца на заз. імя Сталіна ў Ленінградзе.

Аб удзеле масавай сеткі партасьветы ў веснавой с.-г. кампаніі

Усім ГК і РК КП(б)Б

Правядзеньне 3-й бальшавіцкай вясны мае вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне ў выкананьні праграмы чацьвертага заключнага году пяцігодкі. Правільная арганізацыя работы па веснавой с-г. кампаніі ў калгасах на аснове сапраўднай зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі, ураўнілаўкі, барацьбы са спажывецкімі настроямі—зьяўляецца рашаючым у справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і правядзеньня сяўбы. Веснавая с-г. кампанія павінна забясьпечыць карэнны пералом у справе спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі ў напрамку разьвіцьця тэхкультур і жывёлагадоўлі, павінна забясьпечыць падвышэньне ўраджайнасьці і якасных паказьнікаў сельскае гаспадаркі, асабліва ў сацэктары. Выкананьне гэтых вузлавых і рашаючых задач веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі будзе залежаць ад таго, як усе раённыя і нізавыя арганізацыі, на аснове 6-ці ўмоў тав. Сталіна, змогуць забясьпечыць апэрацыйнае канкрэтнае кіраўніцтва ходам усёй кампаніі.

Задача ўсіх партыйных, савецкіх арганізацый мабілізаваць увагу рабоча-калгасных і бядняцка-сярэдняцкіх мас аднаасобнікаў на пасьпяховае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб правядзеньні веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі ў 1932 г. Выходзячы з гэтага Культпроп ЦК прапануе:

1. Па ўсіх зьвеньнях партасьветы (ПНЧІ, ВСПШ, кандыдацкія школы, гурткі бягучай палітыкі) на працягу 2-х дэкад распрацаваць пастанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб веснавой с-г. кампаніі, а таксама раённыя пляны кампаніі ў разрэзе калгасу, саўгасу, МТС у залежнасьці ад месца работы школы.

2. Шырока выкарыстаць эпізадычныя формы партасьветы (школы-аднаднёўкі, трохдзёнкі, ударныя дні вучобы і г. д.), якімі ахапіць усіх камуністаў, камсамольцаў, (не ахопленых партпалітвучобай), і беспартыйнага рабоча-калгаснага актыву правёўшы іх па с-с. калгасах, саўгасах, Культпропам РК забясьпечыць работы гэтых школ выкладчыкамі і мэтадраспрацоўкамі, выкарыстаўшы для гэтай мэты райпартактыў.

3. На працягу бліжэйшых 5 дзён правесьці праверку выкананьня ранейшай дырэктывы Культпропу ЦК КП(б)Б аб правядзеньні кароткатэрміновых курсаў нізавога кіруючага партактыву (старшыень сельсаветаў, калгасаў, сакратароў ячэек) па пытаньнях веснавой кампаніі.

4. Культпропам РК перад пачаткам распрацоўкі ў сыстэме партасьветы (па ўсіх зьвеньнях партасьветы і эпізодычных яе формах) задач правядзеньня веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі правесьці прапсэмінары і нарады прапаганды сяўбы—кіраўнікоў партшкол і вылучаных для гэтай мэты таварышоў па пытаньні веснавой кампаніі.

5. Дому камасьветы ў 5 дзённы тэрмін выдаць мэтадараспрацоўку для сеткі партасьветы аб задачах веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі на аснове пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР па гэтым пытаньні. Партгабінэтам і мэтадбюро пры РК прыстасаваць іх да мясцовых умоў.

Распрацоўка задач 3-й бальшавіцкай вясны ў сетцы партасьветы павінна быць шчыльна ўвязана з практычнай работай праводзімай партарганізацыяй у гэтай галіне. Практычная праца школ у веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі павінна праходзіць мэтадамі:

а) арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва паміж школ і слухачоў;

б) арганізацыі грамадзкага буксіру для адстаючых школ.

в) арганізацыі ў раённым маштабе конкурсу на лепшую школу і слухача па ўдзелу ў веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі 1932 г.

Удзел слухачоў партшкол прамы словых і транспартных у правядзеньні веснавой кампаніі павінен выразіцца ў:

а) арганізацыі рабочых брыгад для рамонту с.-г. інвэнтара і машын;

б) забесьпячэньні ва ўдарным парадку выкананьня прамфінплянаў прадпрыемстваў, сельска-гаспадарч. машына-будаўніцтва і запасных частак;

в) забесьпячэньні сваячасовай дастаўкі іх на месцы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу сеткі партасьветы транспартных арганізацый на сваячасовае прасоўваньне насеньня, угнаеньня, машын, інвэнтара і інш., вядучы рашучую барацьбу з затрымкай і засылкай грузаў;

г) арганізацыі рабочага шэфства над саўгасамі, МТС, калгасамі па аказаньні ім дапамогі ў арганізацыі працы, нармаваньні і г. д.;

д) канкрэтнай дапамозе гарадзкіх школ вясковым, шляхам выезду.

Партшкол вясковых:

а) быць ініцыятарамі і перадавікамі па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасаў, саўгасаў, МТС на лепшыя паказьнікі правядзеньня кампаніі, арганізацыі сустрэчных пляноў па веснавой с.-г. кампаніі;

б) арганізацыя брыгад і дача асобных заданьняў па падрыхтоўцы с.-г. інвэнтара, трактараў, цягавай сілы да сустрэчы сяўбы, па забесьпячэньні і засыпцы насенных, страхавых, фуражных фондаў, па арганізацыі працы ў саўгасах, калгасах, па давядзеньні пляноў сяўбы да кожнага калгасьніка і бядняцка-сярэдняцкіх аднаасобных гаспадарак, па падвышэньні якасных паказьнікаў сельскай гаспадаркі і г. д.;

в) па ўзьняцьці шэфства над калгасам, ўсёй школай па дапамозе яму ў лепшым правядзеньні веснавой кампаніі;

г) па культурным і агітацыйна-масавым абслугоўваньні калгасьнікаў і аднаасобнікаў у часе 3-й бальшавіцкай вясны. Работа з актывам калгасаў, больш падрыхтаваных слухачоў па пытаньні веснавой с.-г. кампаніі (насьценгазэты, арганізацыя дакладаў веснавой кампаніі, лекцыі, аграномаў, вэтэтэхнікаў і інш.). Апроч гэтых форм могуць быць ужыты і іншыя формы практычнай работы партшколы.

Прапануецца культпропам РК забясьпечыць правядзеньне гэтых мерапрыемстваў і кожны месяц даваць зьвесткі ў Культпроп ЦК аб праробленай рабоце партшкол па правядзеньні веснавой с.-г. кампаніі.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

ГУБІЦКІХ АГЕНТАЎ КУЛАКА,

арганізатараў ганеньня на чырвонага партызана—

ДА СУДОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ

(БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН)

Тав. Дзедушкаў Я. Ц.—матрос, актыўны ўдзельнік у Кастрычніцкай рэвалюцыі. У часе грамадзянскай вайны змагаўся на шматлікіх франтох з белагвардзейцамі ў радох матроскіх чырвона-гвардыйскіх атрадаў. Пасьля кантузіі т. Дзедушкаў прыехаў да хаты ў Буда-Кашалёўскую воласьць, але яму ня доўга прышлося адпачываць, трэ' было змагацца з бандытызмам. У часе прыходу белапалякаў ён ідзе ў атрад чырвоных партызанаў у якім змагаецца да канца ліквідацыі франтоў. З сям'і т. Дзедушкава ня раз зьдзекваліся бандыты, мясцовыя кулакі і белапалякі.

З таго часу мінула звыш 10 год. Аднак, клясавы вораг—кулак, якому не ўдалося зьнішчыць т. Дзедушкава, у часе адсутнасьці барацьбы, стаў дзейнічаць абходным шляхам праз некаторых работнікаў Губіцкага сельсавету. Разам з імі кулак пачаў шалёную кампанію супроць тав. Дзедушкава. У 1931-32 г. сельсавет налажыў на яго 93 р. 34 к. сельпадатку, налічыўшы канъюктурных—300 руб. Трэба адзначыць, што раней тав. Дзедушкаў плаціў невялікі падатак. Напрыклад: у 1928-29 г. г.—19 р. 95 к., 1929-30 г.—12 р. 15 к., 1930-31 г. 16 р. 80 к., з якіх было зкінута, як партызану—12 р. 40 к.

У чым справа? Вось у чым. Падкулачнік Пахомаў Іван загадчык Губіцкай Ашчадкасы, у мінулым член сельсавету,—памагаў кулакам рэзаць жывёлу, складаў фіктыўныя акты аб прапажы яё, па якіх кулакі атрымлівалі страхоўку. Гэта т. Дзедушкаў выкрыў і Пахомаў атрымаў тры гады ўмоўна. Моцны заможнік Баўчонак Іван, былы старшыня калгасу «Красін», нам. старшыні сельсавету, які з кулакамі амаль што разваліў калгас; кулакі Палякоў Васіль і Касьцянкаў Паўлюк, якія разбазарылі маемасьць і былі прыняты ў калгас Ваўчонкам Іванам. (Цяпер яны фармальна выключаны з калгасу, але усё яшчэ атрымліваюць прадукты і карыстаюцца калгаснай маемасьцю); кулак Катаў Васіль і кулак-гандляр Хацалёў Рыгор сумесна з падобнымі работнікамі сельсавету пачалі помсьціць т. Дзедушкаву за яго былую дзейнасьць і за актыўнасьць яго сына—селькора, які праз друк выкрываў іх махінацыі.

Нядаўна тав. Дзедушкаў Паўлюк даслаў у газету «Савецкая Беларусь» заяву аб тым, што яго сям'я ўціскаецца непасільным падаткам. Гэта заява была пераслана Буда-кашалёўскай РКК-РСІ для разгляду на месцы. Але бюро скаргаў РКК РСІ падышло фармальна і вырашыла справу габінэтна. Аб гэтым сьведчыць адказ дасланы ў рэдакцыю, што «справа Дзедушкава разгледжана, зроблена распараджэньне аб зьняцьці адпаведных процантаў як чырвонаму партызану, аб чым і паведамлена Дзедушкаву» (№ 1414 ад 14/II-1932 г.).

Трэба сказаць, што гэтая пастанова бюро скаргаў РКК РСІ ня мела амаль ніякага ўплыву на губіцкіх саюзьнікаў кулака. Праўда была зроблена спроба зьняць 20 руб. 63 к. па ільготе, але праз некалькі дзён сельсаветам было даслана тав. Дзедушкаву паведамленьне аб уплаце ўсяго падатку 93 р. 34 к., выплаце самаабкладаньня ў ліку 46 р. 14 к. і ўзьнесьні 93 р. 34 к. культзбору гэта па-першае.

Па-другое—клясавы вораг пралезшы ў сельсавет дайшоў да нагласьці. Тав. Дзедушкава пазбавілі званьня чырвонага партызана.

РВК, апрымаўшы гэтую пастанову сельсавету пра т. Дзедушкава, не праверыў яе. «Да рэчы трэба дадаць, што гэтая пастанова «вынесена» пэрсанальна Пахомавым і Ваўчонкам, бяз удзелу астатніх членаў прэзыдыуму сельсавету.

Па-трэцяе,—сельсавет адмовіў Паўлюку Дзедушкаву ў выдачы даведкі, якая была патрэбна яму для працаўлёньня ў навучальную ўстанову.

Аб тым, што Губіцкі сельсавет знаходзіцца ў кулацкім палоне, сьведчаць яшчэ такія факты: недабкладзены па дадзям кулак Катаў Васіль, кулак-гандляр Хацалёў Рыгор, які да гэтага часу ня ўнёс ніводнага рубля падатку. Больш таго, яму дана скідка на 79 р. з 95 руб. накладзеных.

Габінэтнае вырашэньне справы ў Бюро скаргаў РКК РСІ, няўважлівыя адносіны з боку РВК, нятулыя адносіны да рабселькораўскіх допісаў сапраўдных клясаваму ворагу ў арганізацыі ганеньня на чырвонага партызана і яго сына—селькора.

Бюро скаргаў Буда-Кашалёўскай РКК РСІ зрабіла грубую памылку, ня высьвятліўшы сутнасьці справы на месцы. Тое-ж самае зрабіў і РВК, які няўважліва адносіцца да факту пазбаўленьня тав. Дзедушкава правоў чырвонага партызана.

Буда-Кашалёўская РКК РСІ неабходна ў тэрміновым парадку разгледзець справу т. Дзедушкава і вінаватых прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці.

Парафенюк.

Тэлеграма тав. Шаранговіча

УСІМ САКРАТАРОМ ГК І РК КП(б)Б

Прымеце ўсе захады да безадкладнай арганізацыі школьных і дашкольных курсаў.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ

Забясьпечыць падрыхтоўку настаўнікаў і дашкольных работнікаў

(Загадчыкам аддзелаў на однае асьвеце, старшыням гар. і раённых камітэтаў саюзу працасьветы, сакратарам ГК і РК ЛКСМБ)

Пасьпяховае правядзеньне ўсеагульнага навучаньня залежыць ад забясьпечаньня гэтага важнейшага вучастку культурнай рэвалюцыі адпаведнымі педагагічнымі кадрамі.

Вось чаму поўная рэалізацыя раней дадзеных дырэктыў аб арганізацыі кароткатэрміновых 6-месячных школьных пэдкурсаў і 3-х месячных дашкольных курсаў зьяўляецца баявой задачай ад дзелаў народнай асьветы, органаў саюзу працасьветы і камсамольскіх арганізацый.

Аднак, ня гледзячы на гэта, у большасьці раённаў курсы да гэтага часу не арганізаваны, што ставіць пад пагрозу зрыву ўсеагульнае навучаньне ў 1932-33 навучальным годзе і выкананьне пастановы партыі і ўраду аб дашкольным выхаваньні.

З мэтаю ліквідацыі прарыву, які стварыўся, НКАсьветы і ЦП саюзу працасьветы, ЦК ЛКСМБ абязяўчаюць з 5 да 15 сакавіка дэкаднік праверкі выкананьня сваіх дырэктыў аб арганізацыі школьных і дашкольных курсаў.

Мэта дэкадніка забясьпечыць 100-процантнае ўкамплектаваньне курсаў адпаведнымі кантынгентамі і стварэньне нармальных умоў для зьліквідаваньня гэтых курсаў (забясьпечаньне інтэрнатам, харчаваньнем, вучэбнымі прыладамі, выкладчыкамі і г. д.)

Пры правядзеньні дэкадніка ў частцы практычных мерапрыемстваў у арганізацыі як школьных, так і дашкольных курсаў, кіравацца раней дадзенымі дырэктывамі.

НКАсьветы, ЦП саюзу працасьветы, ЦК ЛКСМ падкрэсьліваюць аб перасланьнем адказнасьці загадчыкаў АНА, старшынь ГК і РК працасьветы і сакратароў РК ЛКСМБ за правядзеньне дэкадніка і прапануюць аб выніках паведаміць 20 сакавіка г. г.

Нам. НК асьветы Бялуга
ЦП саюзу працасьветы Зарэмбоўскі.
ЦК ЛКСМБ Рубачык

Забясьпечыць ліквпункт памяшканьнем

Праўленьне калгасу «Чырвоны маяк» не зразумела палітычнага значэньня пытаньня ліквідацыі нянісьменнасьці сярод калгасьнікаў. Ёсьць немат нянісьменных, а ліквпункт у калгасе працуе зусім дрэнна. Няма нават куды зьбірацца на заняткі, бо праўлень не калгасу не пакланяцілася адпусьціць для ліквпункту памяшканьня. Настаўнік Лемеш работай ліквпункту ня цікавіцца, бо лічыць, што гэта для яго лішняя нагрузка.

Х., Ш.

Пастанова Савету Народных Кам'сараў БССР

ПРА ПЕРАДАЧУ БЕЛАРУСКАЙ КНІЖНАЙ ПАЛАЦЕ ПРЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ АБАВЯЗКОВЫХ ЭКЗЭМПЛЯРАЎ ТВОРАЎ ДРУКУ.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Усе друкарні, друкарні - літаграфіі, шклографіі і іншыя паліграфічныя прадпрыемствы, якія знаходзяцца на тэрыторыі БССР, каму-б яны не належалі, павінны да перадачы выдаўцу і выпуску ў сьвет перадаваць бясплатна беспасрэдна ў Беларускую Кніжную Палату пры Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэцы выдадзеныя імі на ўсіх мовах творы друку пералічаных ніжэй катэгорый:

а) кнігі і пэрыядычныя выданьні (г. зн. усе выданьні больш 2-х старонак), а таксама геаграфічныя і тапаграфічныя карты, пляны і ноты з тыражом больш 500 экз. — у ліку 38 экз., а з тыражом 500 экз., і менш — у ліку 29 экз.;

б) адбіткі з кніг і часопісаў, якія маюць самастойны тыраж — у такім самым ліку, як і кнігі; адбіткі без самастойнага тыражу (аўтарскія),—у ліку 5 экз.;

в) рэспубліканскія газэты ў ліку 32 экз.;

г) раённыя газэты, шматтыражкі і інш. газэты — у ліку 12 экз.;

д) графічныя творы (плякаты, схэмы, дыяграмы, малюнкі, партрэты, насьценныя табліцы і г. д.)—у ліку 10 экз.;

е) лістоўкі, г. зн. выданьні ў 1-2 стар. (абвесткі, афішы, адозвы і г. д.)—у ліку 6 экз.;

2. Калі творы друку, паказаныя ў арт. 1, выдаюцца адначасова ў розных па якасьці тыражох, дык у Беларускую Кніжную Палату перадаюцца экзэмпляры лепшай якасьці. Стэрэатыпныя выданьні павінны перадавацца ў Кніжную Палату ў такім самым ліку, як першыя выданьні.

3. Адзін поўны экзэмпляр усіх паказаных у арт. 1 выданьняў захоўваецца ў Беларускай Кніжнай Палаце, якая арганізуе з іх архіў друку БССР.

4. Беларуская Кніжная Палата павінна перадаваць паказаныя ў пп. «а» і «в» арт. 1 выданьні ў двох поўных экзэмплярах ў наступныя бібліятэкі:

а) Беларускую Дзяржаўную Бібліятэку ў Менску;

б) Публічную Бібліятэку Саюзу ССР імя Леніна ў Маскве;

в) Бібліятэку Камуністычнае Акадэміі ў Маскве;

г) Бібліятэку Усесаюзнай Акадэміі Навук у Ленінградзе;

д) Дзяржаўную Публічную Бібліятэку ў Ленінградзе;

е) Усенародную Бібліятэку Украіны ў Кіеве;

ж) Дзяржаўную Бібліятэку імя Караленка ў Харкаве;

з) Публічную Бібліятэку ССР Грузіі ў Тыфлісе;

і) Сярэдня - Азіяцкую Дзяржаўную Бібліятэку ў Ташкенце;

к) Дзяржаўную Публічную Бібліятэку ў г. Баку;

л) Дзяржаўную Публічную Бібліятэку ў гор. Эрывані.

5. Па адным поўным экзэмпляры з паказаных у пп. «а» і «в» арт. 1 выданьняў Беларуская Кніжная Палата павінна перадаваць у наступныя бібліятэкі:

а) Бібліятэку Беларускай Акадэміі Навук;

б) Аддзяленьне Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэкі ў Віцебску;

в) Аддзяленьне Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэкі ў Магілеве;

г) Аддзяленьне Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэкі ў Гомелі;

д) Бібліятэку Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б;

е) Бібліятэку ЦВК БССР;

ж) Бібліятэку СНК БССР.

6. Абавязаць Беларускую Кніжную Палату перадаваць па адным экзэмпляры паказаных у п.п. «г» і «д» арт. 1 выданьняў у наступныя бібліятэкі:

а) Беларускую Дзяржаўную Бібліятэку;

б) Публічную бібліятэку СССР імя Леніна;

в) Дзяржаўную Публічную Бібліятэку ў Ленінградзе;

г) Бібліятэку Камуністычнае Акадэміі;

д) Усенародную Бібліятэку Украіны;

е) Бібліятэку Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б.

7. Абавязаць Беларускую Кніжную Палату перадаваць па 1 экз. паказаных у п. «б» і «е» арт. 1 выданьняў у наступныя бібліятэкі:

а) Беларускую Дзяржаўную Бібліятэку;

б) Публічную бібліятэку СССР імя У. І. Леніна ў Маскве;

в) Дзяржаўную Публічную Бібліятэку ў Ленінградзе.

8. Абавязаць Беларускую Кніжную Палату перадаваць па адным экз. усіх выданьняў дакументальна - інфармацыйнага характару, а таксама па гісторыі і савецкім будаўніцтве выданьняў пералічаных у пп. «г», «д» і «е» арт. 1, у Цэнтраархіў і Музэй Рэвалюцыі БССР.

9. Усе іншыя экзэмпляры твораў друку разьмяркоўваюцца паводле сьпісу, які зацьвярджаецца Народным Камісарыятам Асьветы.

10. Арганізаваць пры Беларускай Кніжнай Палаце спэцыяльны калектар для цэнтралізаванага забясьпечаньня ўнівэрсальных і спэцыяльных бібліятэк СССР выданьнямі тавараў прадукцыі — у платным парадку, а не тавараў у бясплатным. Сьпіс бібліятэк, якія павінны камплектавацца праз калектар, устанаўліваецца для бібліятэк БССР Народным Камісарыятам Асьветы БССР, а для бібліятэк саюзных рэспублік — Камітэтам па загадваньні вучонымі і навучальнымі ўстановамі пры Цэнтральным Выканаўчым Камітэце СССР.

11. Абавязаць усе выдавецтвы, якія знаходзяцца на тэрыторыі БССР, бракіраваць за калектарамі на час да трох месяцаў адпаведную колькасьць экзэмпляраў сваіх выданьняў і перадаваць іх па патрабаваньні Кніжнай Палаты ў калектар з аплатаю тавараў прадукцыі паводле дагавораў, заключаных паміж Палатаю і выдавецтвамі.

12. Гэтая пастанова ўваходзіць у сілу з 1 студзеня 1932 г. З гэтага часу касуецца пастанова СНК БССР «Пра дастаўку ў Беларускую Кніжную Палату пры Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэцы абавязковых экзэмпляраў твораў друку, што выдаюцца на тэрыторыі БССР, і пра размеркаваньне іх паміж дзяржаўнымі кнігасховамі БССР і СССР» (З. З. БССР 1928 г., № 37, паст. 350 і 1931 г. № 29, паст. 201).

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. Бэнэ.

Кіраўнік Справаў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.

15 студзеня 1931 г.
г. Менск, № 33.

Папраўкі

У артыкуле тав. Кайгародава—«Пытаньні гібелі азімых» («Сав. Бел.», стар. 2, № 49) у чацьвертай калёнцы, у другім абзацы перабліты чацьверты сказ: «З усходняга боку маем сільныя марозы і г. д.», правільна трэба чытаць гэты сказ так: «З аднаго боку на ўсходзе мы маем моцныя марозы і амаль мэтровы сьнегавы насьціл як норму; з захаду—наадварот, марозы і сталы сьнегавы насьціл здараюцца як рэдкае выключэньне».

Нам. адказн. рэдактара Г. АДАМСОН.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня	КЕНІГСМАРК
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.	ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ АПОШНІЯ НАВІНЫ
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	ПАДАЗРОНЫ БАГАЖ

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 50

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

г. Менск 20-га лютага 1932 г.

Пра забарону забіваць коняй і пра адказнасьць за незаконны забой і драпежніцкую эксплёатацыю коняй

У адпаведнасьці з пастановай СНК СССР ад 7 сьнежня 1931 году і СНК БССР ад 23 сьнежня 1931 г., Менскі гарадзкі савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў пастанаўляе:

1. Забараніць забой коняй, прыдатных для работы або ў якасьці вытворнікаў, а таксама маладняк апрача яўнага браку.

Забой у кожным пасобным выпадку можа быць дазволены спэцыяльнай камісіяй пры сельсаветах, з абавязковым удзелам вэтэрынара, зоатэхніка, або агранома і члена прэзыдыуму сельсавету.

Дазвол выдаецца пры поўнай гаспадарчай і племяннай непрыдатнасьці коняй і маладняка.

2. За незаконны (без дазволу камісіі) забой коняй і маладняка ў індывідуальных гаспадарках, а таксама за наймыснае калечаньне гэтых коняй і іншыя злосныя ўчынкі, у выніку якіх конь піне, або робіцца непрыдатным для работы, вінаватыя прыцягваюцца да адказнасьці:

а) Адасобныя гаспадаркі штрафуюцца ў адміністрацыйным парадку ў памеры 10-ці разовага кошту забітага, загінуўшага ці давядзенага да непрыдатнасьці каня, паводле мясцовых загатоўчых цэн.

б) Кулакі, прыватныя скупшчыкі, якія самі зрабілі вышэйпаказаны ўчынак, або падбухторылі да гэтага іншых, штрафуюцца ў памеры дзесяцікратнага кошту каня і апрача таго пасаветам канфіскуецца ў адміністрацыйным парадку ўся або частка іхняй жывёлы.

Незалежна ад штрафу і канфіскацыі жывёлы, адміністрацыйным парадкам кулакі і прыватныя скупшчыкі прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

в) За незаконны (без дазволу камісіі) забой коняй у арамаджаным сэктары (калгасы, саўгасы, машынакопныя станцыі, установы і прадпрыемствы), а таксама за наймыснае калечаньне гэтых коняй і іншыя злосныя ўчынкі, у выніку якіх конь піне або робіцца непрыдатным для работы, вінаватыя прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

г) За злачынна нядбайнае абыходжаньне з коньмі і асабліва жарэбнымі матчкамі (эксплёатацыя якіх можа дапушчацца ў нормах, устаноўленых зоатэхнічнымі), у калгасах, саўгасах, машына-копных станцыях, установах і прадпрыемствах, у выніку якога конь загінуў, або зрабіўся непрыдатным для работы, вінаватыя прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

Калі такое абыходжаньне з коньмі мае сыстэматычны характар, або выклікала страту значнай колькасьці коняй, вінаватыя прыцягваюцца таксама да крымінальнай адказнасьці.

д) За нядбайнае абыходжаньне з коньмі, якое ня выклікала нежаданых вышэй вынікаў, на вінаватых накладаецца дысцыплінарнае пакаранне паводле правіл унутранага распарадку і працовыя спагнаньні, паводле існуючых законаў.

3. Гэтая абавязковая пастанова набывае моц са дня апублікаваньня.

4. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на міліцыю і сельсаветы.

Старшыня Менскага гарадзкога савету ВАЛОДЗЬКА.
Сакратар ЛЮЦЬКО.

БАЛЯНС

БЕЛТОРФАБЯДНАНЬНЯ на 1 X 1929 г. і на 1-І 1930 г.

АКТЫЎ

	СУМА 1929 г.	СУМА 1930 г.
1. Маемасьць	1[illegible]0743—23	5154793—38
2. Не[illegible] абаротных сродкаў	1983[illegible]—96	85 247—95
3. Запасы [illegible]	1053—61	92[illegible]8—21
4. Гатовая [illegible]	3 1130—96	215782—9[illegible]
5. Сырэ, асноўныя і дапаможныя матэрыялы	154133—01	77 18—0[illegible]
6. Паліва	4 8[illegible]—5	357[illegible]—04
7. Залуфарбыкаты	1[illegible]46—42	3 9[illegible]1—37
8. Незавершаная вытворчасьць	105[illegible]1—8	33820—69
9. Гашавы рэдкі	57191—48	80153—41
10. Зялік з Дзяржбанкам	—	6[illegible]85—1
11. Дэбіторы	61 6[illegible]—6[illegible]	4 4514—24
12. Выдаткі будучых гадоў	470[illegible]9 52	1[illegible]3 9—03
13. Страт	—	168532—41
Баланс	30 3 17—29	10079 2—58

ПАСЫЎ

	СУМА 1929 г.	СУМА 1930 г.
1. Уставны капітал	2496 58—20	7648399—51
2. Амортызацыя [illegible] капітала	4 905—68	34[illegible]61—[illegible]7
3. Фонды:		
а) ФУБР		
б) [illegible]	757—57	10874—26
4. Розныя	9222—58	30113—74
5. Кредыты [illegible] фінансіраваньні	176[illegible]00 —	462354—38
6. Разьлікі з Дзяржбанкам	—	5930 4—[illegible]3
7. Крэдыторы	321673—26	99[illegible]084—97
Баланс	3043317—29	100795 2—58

Асноўныя паказьнікі гаспадарчай дзейнасьці

	Па плану на 1930 г.	Фактычна: 1930 г.	Фактычна: 1929 г.
1. Выпадзенка [illegible] відаў масавай прадукцыі ў натуры	31[illegible]048	22[illegible]174	1226[illegible]3
2. Валавая прадукцыя на сабекошт	1650 83	1890 53	3 5693
3. Рэалізацыя [illegible]	1065076	639[illegible]47	158413
4. Сярэдня-гадавы лік рабочых	1509	1335	329
5. [illegible] стажачых і мясцовых	401	357	—
6. Фонды заработнай платы рабочых	110 400	1012 00	184715
7. [illegible] служачых	155[illegible]0	15 8 0	2[illegible]85
8. Зарэзервавана [illegible]	—	108 7	8[illegible]3
9. Капітальныя ўкладаньні	4228[illegible]8	32070 6	5091 8
У тым ліку новыя прадпрыемствы	1632150	85[illegible]735	120[illegible]25
10. Здача ў эксплёатацыю		2474105	452750

Рахунак прыбыткаў і страт

Страты

	СУМА 1930 г.	СУМА 1929 г.
1. Аграпрадпрыемствы	38100 09	[illegible]0764—14
2. Пераходныя	92[illegible]9—14	10 79—70
3. Агульнагадавыя выдаткі	12 7[illegible]4—91	[illegible]296—95
4. Выдаткі [illegible]	32756—97	8348—64
5. Іншыя выдаткі	614[illegible]7—7	4799—59
Усяго	25[illegible]308—21	49889—02

Прыбыткі

	СУМА 1930 г.	СУМА 1929 г.
1. Ад [illegible]	6[illegible]55—52	5155—80
2. Пераходныя	44[illegible]6—78	5[illegible]91—15
3. Іншыя даходы	23[illegible]5—50	8 63—55
4. Чыстыя страты	1[illegible]8532—41	3[illegible]275—52
	2663[illegible]8—21	49889—02

Кіраўнік Белторфу АРНДТ

Загадчык СЭС БАБІЦКІ

Гарадоцкі ЛТГ ПРАДАЕ
ў лесе Машнікоўскае дачы
7000 р. м. зьмешаных дроў
нарыхтоўкі 1927-28 і 29 году
ў адлегласьці ад чыгункі 35-40 клм.
Асобы жадаючыя купіць адзначаныя дровы зьвяртацца ў ЛТГ штодзённа ад 9 да 5 гадз.

Інстытуту Прамысловасьці
ПАТРАБУЮЦЦА
хэмікі-лябаранты
з акончыўшых хэмпрафшколы, хэмтэхнікумы і хэмфак БДУ,
таксама патрэбны прэпаратары
з адукацыяй сямігодкі.
Заявы падаваць у інстытут: Пляц Волі, 21-1, (пам. ВСНГБ).

МЕНБУДТРЭСТУ
ПАТРАБУЕЦЦА
МАШЫНІСТКА
на сталую працу
(Пляц Волі, 4)

29-ІІ згублены пашпортныя расьпіскі, ведамасьці і інш., выданыя 1-му і 2 рамонтна-будаўнічым вучасткам.
Знайшоўшага просьба вярнуць за ўзнагароду 50 руб., па адрасе: Брылёўскі зав., 59, тэл. 14-67, Грынькевічу.

Грамадзянін Дрыгайл Абраи Рамазіч (Рувінавіч), родам з грамадзян с. Махава, таго-ж сельсавету, Магілеўскага раёну, пражываючы ў горадзе Магілеве па Сялянскай вул., д. № 16 зьмяняе сваё імя «Абрам» на імя «Уладзімер».
Просьба да асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены імя, паведаміць аб гэтым Магілеўскі Гарадзкі ЗАГС, паказаўшы сваё прозьвішча, імя, імя па бацьку і месца жыхарства.

Упаўнаваж. Галоўлітбела. № А—53.

Друкарня імя Сталіна.